PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 16 (2449) Год XLVIII | Беласток, 20 красавіка 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Бог і ахвяры прабачаюць катам

7 красавіка ў Беластоцкім аддзеле Інстытута нацыянальнай памяці адбылася дэманстрацыя фільма Войцеха Варатынскага „Bóg przebacza zawsze". Фільм расказвае пра пацыфікацыю вёскі Залешаны Бельскага павета атрадам нацыянальнага падполля, якім камандаваў Рамуальд Райс „Буры". Варатынскі паказаў трагедыю вёскі вачыма Сяргея і Марыюша Нічыпарукоў — сына і ўнука аднае з ахвяр. Сяргей патраціў бацьку і трох братоў, з якіх найстарэйшаму было 7 гадоў.

Рэжысёр надта трапна адлюстраваў вобраз антыкамуністычнага падполля ў свядомасці беларускага насельніцтва. Фільм пачынаецца песняй Дарафея Фіёніка пра Залешаны, якая стала ўжо своеасаблівым музычным помнікам ахвярам шавіністычнага шаленства на Беласточчыне ў пасляваенны перыяд. Пра „Бурага" і яго ахвяры ў фільме разважаюць вучні Бельскага белліцэя. „«Буры» для нас быў і астанецца катам, для палякаў заўсёды будзе героем", — вельмі трапна заўважыў ліцэіст.

Ад падзелу свету на ахвяр і катаў прабавалі ўцячы Нічыпарукі. Хацелі яны сустрэцца з сынам павешанага за антыкамуністычную дзейнасць „Бурага", таксама Рамуальдам, які дабіўся рэабілітацыі бацькі і кампенсацыі за яго смерць. Яны спачуваюць сыну „Бурага" і хацелі б працягнуць яму руку над магіламі продкаў. Малады Нічыпарук гатовы паставіць супольны помнік удзельнікам драмы ў Залешанах, злачынцам і ахвярам, які заахвочваў бы да рэфлексіі над тым, што здарылася ў студзені 1946 г. Райс не адказаў на ніводную прапанову. Нічыпарукі звярталіся таксама да Беластоцкага аддзела Ветэранаў АКаўскай арганізацыі, якія адкрыта лічаць „Бурага" героем. Ніхто з іх не згадзіўся стаць партнёрам у дыскусіі.

Недзе збоку галоўнай тэмы выплывае справа вазакоў загінуўшых у Пухалах-Старых. Здымкі з перапахавання астанкаў 27 вазакоў супастаўленыя з пастановай вайсковага суда III Рэчы Паспалітай аб рэабілітацыі „Бурага" выглядаюць як іронія, чарговы здзек над ахвярамі яго злачынстваў. Варатынскі сказаў, што гэтая пастанова і прымусіла яго зрабіць такі фільм. Сяргей Нічыпарук таксама адчувае сябе прыгнечаным рашэннем суда і не верыць у справядлівасць.

Святар, які служыў паніхіду за душы загінуўшых, звярнуў сем'ям ахвяр увагу, што чалавек можа і павінен прабачаць, што Бог заўсёды прабачае, а гісторыя бывае найбольш справядлівым суддзёй і расставіць усё на свае месцы. Для „Бурага" гісторыя яшчэ не абвясціла канчатковага прыгавору.

Яўген Мірановіч

Фота АННЫ ПУЛАСКАЙ

Валянціна Трыгубовіч, Андрэй Саннікаў, Тобіяс Кнубен (ззаду), Беласток, 5.04.2003 г.

Сучаснасць і перспектывы ЕС

Аляксандр Максімюк

Няварта сядаць за еўрасаюзны стол перамоў, калі перш не пакласці на яго акрываўлены нож, — гэтак нібыта аднойчы прызнаўся Кшыштафу Бабінскаму, рэдактару і выдаўцу часопіса „Унія і Польшча", пасол Іспаніі. У змаганні краін за свае інтарэсы ў Еўрапейскім Саюзе ўсе сродкі — акрамя ваеннага — дазволены. Выступленне К. Бабінскага ў гэткім вельмі вобразным стылі прагучала ў час канферэнцыі „Беларусь і Еўрасаюз: сучаснасць і перспектывы", якую арганізаваў Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь 5 і 6 красавіка ў Беластоку. Суарганізатарамі былі Таварыства аматараў ведаў „Філаматы" з Мінска і Фонд Конрада Адэнаўэра з Варшавы.

Чым бліжэй да моманту ўступлення Польшчы ў ЕС, тым больш увагі адводзіцца жорсткаму эканамічнаму рахунку гэтага кроку. І адбываецца тое на ўсіх узроўнях, таксама і сярод інтэлектуальных элітаў. Вось і ў час выступу К. Бабінскага — ураджэнца Вялікабрытаніі, супрацоўніка „Financial Times", які ў Польшчу перабраўся ў 70-я гады — перад беларускімі гасцямі канферэнцыі гучалі перш за ўсё эканамічныя аспекты (сярод беларускіх удзельнікаў канферэнцыі былі, між іншым, чацвёра рэпрэсаваных арганізатараў „Маршу за лепшае жыццё" 12 сакавіка ў Мінску — Зміцер Бандарэнка, Людміла Гразнова, Леанід Малахаў і Андрэй Саннікаў). Ніхто і не прабаваў заікнуцца, што запрашэнне ў Еўрасаюз — адзнака дасягнення краінай палітычнай стабільнасці, дэмакратыі, уступлення на шлях у дабрабыт, адзнака прыналежнасці да заходняга круга культуры і традыцыі — перш за ўсё палітычнай. Ну бо і як тут узважаць гэтыя светлыя каштоўнасці, калі пасля ўваходу Польшчы ў ЕС, па словах К. Бабінскага, заходняга дабрабыту наступным краінам можа ўжо і не хапіць. Еўрасаюз узнік у час халоднай вайны як цывільнае заплечча НАТА. Была гэта, між іншым, і арганізацыйная формула дазбраення пасляваеннай Нямеччыны і накіравання ейнай актыўнасці супраць саветаў, а не Францыі. Цяпер Еўрасаюзу трэба знайсціся ў новых умовах. ЕС — арганізацыя, у якой няма ні свайго войска, ні паліцыі, кіруюць ім чыноўнікі. Гэта, паводле К. Бабінскага, яшчэ не мафія, але сапраўднае павуцінне. Недахоп добрых чыноўнікаў — галоўная загана Польшчы на парозе Еўрасаюза. Уваход у ЕС Партугаліі, Іспаніі і Грэцыі быў мерай, якою Еўропа засцерагалася ад паўтору дыктатураў у гэтых краінах. Пра тое ж, на думку К. Бабінскага, ідзе і ў выпадку Польшчы.

Уваход у ЕС дзесяці новых краін — сапраўдны выклік. Новыя члены больш праамерыканскія, чым праеўрапейскія — узнікае тут пытанне новага характару Еўрасаюза. На думку польскага выступоўца, ЕС павінен быць не столькі геаграфічнай арганізацыяй, колькі агульнай формулай дасягнення міру, дабрабыту і прагрэсу. Паводле К. Бабінскага, Польшча на добрай дарозе прайграць свой еўрасаюзны рэферэндум — прыхільнікі ЕС вераць у свой выйгрыш, бо на гэта паказваюць апытанні грамадскай думкі, але людзі не кажуць у іх праўды. Затое праціўнікі згодна выстраіліся ў шыхты і вельмі моцна працуюць на „не".

[працяг ☞ 2]

Спакойнага і радаснага Велікоднага святкавання ўсім чытачам жадае рэдакцыя „Нівы"

Візіт Камісіі нацыянальных меншасцей ☞ 3

Ад меншасцей першым выступіў Ян Сычэўскі, старшыня ГП БГКТ. На пачатку звярнуў ён увагу на адсутнасць кампактнага меншаснага юрыдычнага акта. Затым сказаў, што меншасці адчуваюць сябе прыніжанымі выказваннямі некаторых парламентарыяў.

Партыя! Як быць далей? ☞ 4

Владзімеж Цімашэвіч на падляшскім з'ездзе СЛД асцерагаў сваіх партыйных калег, каб не паўтаралі памылак Выбарчай акцыі Салідарнасць. А шэф камісіі этыкі Саюза праф. Марыя Шышкоўская — што дзеянні кіруючай сёння Польшчай і рэгіёнам групоўкі размінаюцца з грамадскімі спадзяваннямі.

Сербалужычане ў Нямеччыне ☞ 5

Новае еўрасаюзнае заканадаўства стварыла магчымасць усебаковага развіцця сербалужыцкай культуры. Выдаецца газета „Сербскія навіны", тыднёвік „Розгляд", адміністрацыя Саксонскага ланда гатова стварыць умовы для развіцця ўсіх формаў навучання на сербскай мове, на лакальным тэлебачанні працуе рэдакцыя перадачы для гэтай меншасці, на хвалях радыё кожнага дня чуваць мясцовую славянскую мову.

З запаленай свечкай ☞ 9

З юных гадоў запамятала я асабліва Вялікі тыдзень. Тады дзеці і падросткі мелі найбольш працы: трэба было прыбраць панадворкі і вуліцы перад сваёй сядзібай. Добра захавала ў памяці і Вялікі чацвер, калі вярталіся два кіламетры — з царквы ў Шчытах у Крывую — з запаленай свечкай, а пасля абыходзілі свае будынкі, каб блаславіць на ўсё добрае.

Беласточчына на старонках „Беларускага летапісу" ☞ 10

Кожны нумар часопіса „Беларускі летапіс" друкаваў навіны пад рубрыкай „Наша хроніка". У красавіцкім нумары за 1937 год паведамлялася, што была пакарана штрафам 200 зл. Ганна Абуковіч — старшыня ўправы таварыства „Полымя" за тое, што арганізавала таварыства працаўнікоў беларускага тэатра „Полымя" без адпаведнага паведамлення адміністратыўных улад. З-за іх не адбыўся канцэрт у беластоцкім тэатры „Palace".

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Першым заўсёды цяжка

Усё часцей масавыя акцыі пратэсту ў Беларусі маюць вузка спецыяльную накіраванасць. З аднаго боку гэта сведчыць аб тым, што не вельмі шырокаму колу грамадства ў краіне замінае цяперашняе становішча, а з другога, пацвярджаецца слушнасць прымаўкі „дзе тонка, там і рвецца".

З пачатку года адстойваць свае інтарэсы прыватным прадпрымальнікам даводзіцца не ў першы раз. Гэтая група насельніцтва аб'яднаная ў розныя, часам канкуруючыя, грамадскія арганізацыі ўжо доўгі час вядзе барацьбу за існаванне ва ўмовах усё больш мацнеючых камандна-адміністрацыйных тэндэнцый беларускай эканомікі.

2 красавіка на шэрагу рынкаў некалькіх гарадоў прайшлі прадпрымальніцкія забастоўкі. Мерапрыемства, наладжанае грамадскім аб'яднаннем „Перспектыва", мела на мэце адмену прэзідэнцкіх дэкрэтаў, якія, на думку прыватных гандляроў, устанаўліваюць занадта вялікія падаткі і ўзмацняюць дзяржаўны ціск на дробны бізнес. Акцыя, гучна названая Усебеларускім страйкам прадпрымальнікаў, на першы погляд, сваіх мэт не дасягнула. Беларускі парламент не звярнуў увагу ні на самае мерапрыемства, ні на тыя 16 тысяч подпісаў прадстаўнікоў дробнага бізнесу з вышэйазначанымі патрабаваннямі. Палата прадстаўнікоў прыгнятальнай большасцю прыняла „да ведама" Дэкрэт № 3, які тычыцца сацыяльных адлічэнняў з прадпрымальніцкіх даходаў, чым вельмі расчаравала пратэстуючых супраць яго, бо цяпер ён фактычна адобраны заканадаўцамі. Мала сумнення, што лёс наступнага чацвёртага дэкрэта, які таксама „атручвае" жыццё гандлярам, будзе адрозным.

Лідэр „Перспектывы" Анатоль Шумчанка пасля праяўленай парламентарыямі згоды з прэзідэнцкай адміністрацыяй заявіў, што іхнія размовы пра падтрымку прадпрымальніцтва — папулізм. І гэтыя словы, у асноўным, маюць рацыю. Але толькі ў асноўным.

На сённяшні дзень Палата прадстаўнікоў рыхтуе новую рэдакцыю „Закона аб прадпрымальніцтве ў Рэспубліцы Беларусь". Ягоныя новыя палажэнні пакуль невядомыя шырокай грамадскасці, але распрацоўшчыкі кажуць, што закон мае быць больш ліберальным і носіць у сабе некаторыя нормы расійскага заканадаўства, якое істотней адпавядае інтарэсам людзей бізнесу. Сярод агульных слоў аб важнасці сярэдняга і малога прадпрымальніцтва ў эканоміцы краіны, распрацоўшчыкі пачалі гаварыць аб больш канкрэтных пытаннях. Напрыклад, аб беспрацоўі. Па словах дэпутата Кірыла Халопіка, які адначасова з'яўляецца намеснікам старшыні парламенцкай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі, „сапраўдная колькасць беспрацоўных нашмат большая за афіцыйную — 3,3% і яна будзе толькі расці".

Такія словы выклікаюць разуменне, што перад беларускай эканомікай хутка паўстануць сур'ёзныя праблемы, такія як масавыя звальненні і масавае беспрацоўе. А „выкінутыя на вуліцу" людзі, якія не змогуць у хуткім часе знайсці сабе не толькі сродак да існавання, але і ўвогуле занятак — гэта надта небяспечна і не толькі ў крымінальным плане.

Таму праўдападобна, што не за гарамі той час, калі для трымаючых уладу пытанне яе захавання стане важнейшым за жаданне адміністравання ўсялякай дзейнасці. Зразумець гэта прымусіць сучасная эканоміка, перадавым атрадам якой у Беларусі і з'яўляюцца пастаянна страйкуючыя прыватныя прадпрымальнікі. Хоць, магчыма, не ўсе яны разумеюць такую сваю ролю, мяркуючы, што пратэстуюць супраць асобных палажэнняў асобных дэкрэтаў і законаў.

Уладзімір Лапцэвіч

Вачыма паляка

Пара на пабудку

Вось завітала ў Беласток, Гайнаўку, Бельск-Падляшскі і Орлю сеймавая Камісія нацыянальных і этнічных меншасцей (дэталёвае апісанне выязнога пасяджэння чытайце на стар. 3). Папраўдзе, не камісія, а пяцёра з пятнаццаці яе членаў. Старшыня камісіі Генавефа Вісьнёўска з Самаабароны выбрала ў гэты час службовае падарожжа ў Іспанію, а ейны віцэ-старшыня Ежы Штэліга дапытваў чарговых сведак у рамках следчай камісіі, якая займаецца г.зв. справай Рывіна. Таму за выязным пасяджэннем сачыў Ежы Чэрвінскі з каталіцка-нацыянальнага гурту, вядомы тым, што аспрэчвае патрэбу стварэння закону аб меншасцях, над якім Сейм працуе ўжо 13 гадоў. І незалежна м.інш. ад прысутнасці абараняючага ў парламенце правы беларусаў і шырэй — праваслаўных, падляшскага дэпутата Яўгена Чыквіна, хіба марна спадзявацца ад гэтай „экскурсіі" нейкіх вынікаў. Сам дэпутат Чэрвінскі заявіў, што ўсе пачутыя пастулаты будуць перададзены адпаведным міністэрствам, але не можа абяцаць, што будуць яны ўзняты і ажыццёўлены. Вядома, большасць спадзявалася на грошы, а ў сувязі з „вузкім бюджэтным горлам" можна тыя мроі *między bajki włożyć*.

Чарговы, ды і не з казак узяты, паказ даў пры нагодзе візіту дэпутат ад Лігі польскіх сем'яў (LPR) Анджэй Фэдаровіч. Заклікаў ён нашых беларусаў да асіміляцыі. Здзіўляе мяне гэты пункт гледжання, бо — як ад стагоддзяў вядома з гісторыі экстрэмальных дзеянняў — лягчэй „спацыфікаваць" асяроддзе, якое вылучаецца або ў нейкім сэнсе, заўважальнае. Асіміляцыя згрузіць беларускасць у мора польскасці. Кажу гэта так сабе, бо не маю намеру дыскутаваць з дэпутатам Фэдаровічам. Іначай, трэба было б вярнуцца да таго, каб тлумачыць аб карысцях, якія вынікаюць са шматкультурнасці. Як тут уваходзіць у палемікі з Фэдаровічам, калі для яго ў Польшчы ёсць адна культура — польская (вялікапольская; тут справа не ў адміністрацыйна-геаграфічным рэгіёне)?

З другога боку — гэта добра, што дэпутат Фэдаровіч час ад часу аб'яўляе свае тэорыі. Можа ён толькі па прынцыпе супраціву ўзмоцніць пачуццё тоеснасці нацыянальнай меншасці, асабліва сярод маладых. Я веру, што мінулі ўжо часы, калі беларусаў можна было запалохаць. Раз, калі гэта адбывалася рукамі ваюючай ПАРП, іншы раз — ваюючай „Салідарнасці". Лозунгі Фэдаровіча трапляюць на прыхільны грунт галоўным чынам пастарэлых ды багамольных паняў, гурта, які нават у цэнтрах даследаванняў грамадскай думкі не мог бы быць прадстаўнічай групай для грамадзян III РП, не ўспамінаючы ўжо аб грамадзянах Еўропы, у якое саюзных структурах і мы, пэўна, будзем, і, на жаль, са спадаром Фэдаровічам, нават калі ён гэтага сабе не пажадае.

* * *

У будучым годзе, перад уваходам Польшчы ў Еўрасаюз, але неабавязкова з панам Фэдаровічам, разам з ранейшымі парламенцкімі выбарамі маюць адбыцца выбары ў Еўрапейскі парламент. Польшча зойме 50 месцаў (мабыць, і 54). Агулам пасля ўваходу новых дзесяці краін засядаць у ім будзе 732 парламентарыі. Невядома, як будзе выглядаць закон аб выбарах, а, што важнейшае, як мае выглядаць падзел краіны на выбарчыя акругі. Гаворыцца аб двух метадах. Паводле аднаго, на акругу, якая ахоплівае Вармінска-Мазурскае і Падляшскае ваяводствы, выпадзе тры, а паводле другога — два мандаты. Беручы пад увагу апошнія выбары ў польскія Сейм і Сенат, дасталіся б яны ў рукі прадстаўнікоў СЛД. Што важнейшае, нельга будзе спалучаць мандат у польскім парламенце з мандатам у ЕП. Беручы пад увагу значны спад падтрымкі для ўрада і ўсяго СЛД, гэта групоўка, у так спалучаных ваяводствах і пры выбарчых тэндэнцыях апошніх гадоў — можа разлічваць на адзін або і два мандаты, а нават, пры прымяненні першага метаду, нават тры. Можна дадумвацца, што ў Еўрапейскі парламент будзе балатавацца сённяшні міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, дагэтуль лакаматыў падляшскага спіска СЛД. У апошніх выбарах „забраў" ён з сабою ў Сейм двух дэпутатаў. Калі б В. Цімашэвіч рашыўся кандыдаваць у ЕП, то яго беларускі электарат, які аддае свой голас у Сейм і Сенат, застанецца, так сказаць, асірацелым. Думаю, што ўсынавіць яго мае ўсыплены пасля апошніх самаўрадавых выбараў заснаваны ў Беластоку Беларускі выбарчы камітэт. Думаю, што пара ўжо прабудзіцца. Хоць бы дзеля таго, каб фактычна прадстаўнічай для беларусаў была сеймавая Камісія нацыянальных меншасцей і з сеймавай трыбуны не мусілі прапаведаваць свае глыбокія думы „паслове Фэдаровічове".

Мацей Халадоўскі

Сучаснасць і перспектывы ЕС

[1 ☞ працяг]

У дыскусіі Валянціна Трыгубовіч пажартавала, што Беларусь можа дапамагчы Польшчы выйграць рэферэндум — прысылаючы сюды на час рэферэндуму Лідзію Ярмошыну (старшыню Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі).

У ходзе канферэнцыі былі яшчэ заслуханы даклады Кастуся і Аляксея Хадыкаў, Пятра Садоўскага (першага пасла Беларусі ў Нямеччыне), Альжбеты Смулковай (першай пасол Польшчы ў Беларусі), Андрэя Саннікава, Валянціна Голубева, Тобіяса Кнубена (дырэктара Інстытута нямецкіх даследаванняў Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта ў Мінску). Даклады датычылі адносін Беларусі з суседзямі, беларускага менталітэту і беларускага погляду на Еўрасаюз і НАТА.

Праеўрапейскія рысы беларускага менталітэту, паводле дакладчыкаў, праяўляліся ўжо з сярэдніх вякоў (для мяне прагучала тое, быццам пасля гадоў даказвання адзінства з Руссю, беларусы гвалтам сталі даказваць адзінства з Еўропай). Гэты момант і пакрытыкавала Людміла Гразнова ў ходзе дыскусіі. На яе думку, не трэба тут заглыбляцца ў сівую мінуўшчыну, а ўсе пытанні асэнсоўваць з пункту погляду блізкай постсавецкай гісторыі. Грэкі, якія маюць за сабой вялікую традыцыю дэмакратыі, у апошнім стагоддзі зусім не былі ўзорам паводзін. Немцы ж — адзін народ — на працягу двух дзесяцігоддзяў прадэманстраваў два адрозныя менталітэты. А ўрэшце ж чалавеку з еўрапейскім менталітэтам дастаткова два разы паслухаць беларускага прэзідэнта, каб на яго не галасаваць.

Тобіяс Кнубен прадставіў удзельнікам выдадзеную ў 10-годдзе нямецка-беларускіх дыпламатычных зносін кнігу (нямецкае прадстаўніцтва ў адроджанай Беларусі адкрылася ў Мінску ў 1992 г.). Сказаў, што Нямеччына адчувае асаблівую адказнасць за краіну, якая была знішчана нямецкімі рукамі. На яго думку, Беларусь павінна больш адкрыта карыстацца тою дапамогай, якую ахвяроўваюць цяперашнія ўрады Нямеччыны. Гучная справа Драздоў, у выніку якой усе паслы пакінулі Беларусь, была палагоджана ў 1999 г., але паміж Беларуссю і Еўрасаюзам засталася прорва. На думку былога пасла ў Нямеччыне, П. Садоўскага, Беларусі і яе элітам трэба было б мацней вывучаць нямецкую паліталогію, яе парламентарызм, а не карміцца ўсё расійскай паліталогіяй і расійскім светабачаннем. У нас вельмі шмат зроблена, — сказаў П. Садоўскі, — але вянчальнага галаўнога ўбору ўсё не хапае.

Аляксандр Максімюк

Візіт Камісіі нацыянальных меншасцей

У днях 1 і 2 красавіка г.г. сеймавая Камісія нацыянальных і этнічных меншасцей наведала Падляшскае ваяводства. У першы дзень члены Камісіі былі на Святой Гары Грабарцы і ў бельскай школе іканапісу, а пасля ў канферэнцыйнай зале Падляшскай ваяводскай управы сустрэліся з кіраўнікамі ваяводскіх і гарадскіх улад ды з прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей, пражываючымі ў нашым рэгіёне. Камісію ўзначальваў намеснік яе старшыні Ежы Чэрвінскі; адсутнічалі яе старшыня, выбраная ў Сейм з Беласточчыны Генавефа Вісьнёўска ды шматгадовы намеснік старшыні Ежы Штэліга.

Сустрэчу адкрыў падляшскі ваявода Марэк Стшалінскі, які сказаў, што цывілізацыйны ціск і міграцыя давялі да рассеяння дагэтуль кампактных меншасных грамадскасцей. Падкрэсліў ён патрэбу стварэння ім умоў для захавання мовы і традыцыі продкаў. Затым віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч пазнаёміў Камісію са станам меншаснай асветы і культуры ў нашым ваяводстве.

Ад меншасцей першым выступіў Ян Сычэўскі, старшыня Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства. На пачатку звярнуў ён увагу на адсутнасць кампактнага меншаснага юрыдычнага акта. Затым сказаў, што меншасці адчуваюць сябе прыніжанымі выказваннямі некаторых парламентарыяў. Пасля звярнуўся да членаў Камісіі з заклікам паскорыць апрацаванне закону аб нацыянальных меншасцях: праект закону не ўводзіць шмат навінак і не стварае пагрозы бюджэту — справа тут у добрай волі. Сёння абставіны дрэнныя: на працягу дзесяцігоддзяў наш рэгіён занядбоўваўся цывілізацыйна, асабліва на вёсцы ў час трансфармацыі. Выклікае гэта міграцыю і натуральнае нацыянальнае асяроддзе вымірае. На вёсцы беларуская культура замірае, а ў горадзе размываецца ў большасці і імкліва асімілюецца. Пагражае нам, што за некалькі дзесяцігоддзяў наша нацыя перастане існаваць. Беларускі музей у Гайнаўцы без бюджэтнага падмацавання не зможа існаваць. Спадар Сычэўскі падзякаваў ваяводу за станоўчае вырашэнне справы помніка забітым вазакам у Бельску, але выказаў расчараванне ацэнкай пасляваенных падзей польскімі даследчымі ўстановамі. Гэтаксама крытычна выказаўся ён і пра пераходзячы ў традыцыю звычай адводу ў прапановах новага бюджэту значна меншых чым папярэдне сродкаў на патрэбы нацыянальных меншасцей; заўсёды трэба хадайнічаць за іх карэктуру. Прамоўца звярнуў таксама ўвагу, што ў малых школах асветная субвенцыя недастатковая для аплачвання навучання мовы меншасцей. Таксама міждзяржаўныя польска-беларускія адносіны адмоўна ўплываюць на захаванне нацыянальнай тоеснасці.

Адказваючы Яну Сычэўскаму старшыня Чэрвінскі сказаў, што кожны пасол незалежны ў сваіх выказваннях. Адносна закону аб нацыянальных меншасцях патлумачыў, што затарможваецца ён з прычыны ратыфікацыі Польшчай хартыі рэгіянальных моў. Выказваліся яшчэ і іншыя прадстаўнікі сталічных улад.

Пасля іх папрасіў голас аўтар згаданых Янам Сычэўскім выказванняў, пасол Анджэй Фэдаровіч. Заявіў ён пра сваю ўвагу для сужыцця і супрацоўніцтва. Значная частка жыхароў ранейшага Беластоцкага ваяводства адчувае сябе палякамі праваслаўнага веравызнання, у тым ліку і некаторыя актывісты ягонай Лігі польскіх сем'яў. Заклікаў ён, каб адчуваць сябе палякамі праваслаўнага веравызнання. Нельга абвінавачваць паслоў у тым, заявіў ён, што хочуць аб'яднаць народ; і добра, што адбываецца асіміляцыя.

Пасля сваёй заявы пасол Фэдаровіч пакінуў залу і голас узяў пасол Яўген Чыквін, які выказаў шкадаванне за выступленне свайго парламенцкага калегі.

Станіслаў Станкевіч, які выступаў ад ромаў, выказаў задавальненне сустрэчамі школьнікаў з прадстаўнікамі меншасцей: моладзь цікавіцца іншасцю.

Яўген Вапа, старшыня Беларускага саюза, выказаў занепакоенасць перадачай адказнасці за справы культуры ў рукі няўрадавых арганізацый. Адмоўна ацаніў ён таксама стан міжкультурнай адукацыі. Пытаў ён, чаму беластоцкія тэатр і філармонія не ставяць твораў аўтараў з Беларусі, Літвы і Украіны — гэта перасякае кантакт меншасцей з іх нацыянальнай культурай. Спытаў ён, хто з'яўляецца гарантам хадайніцтва за грантамі, калі культурныя арганізацыі не маюць уласных сродкаў.

У якасці адказчыка, апрача сталічных і гарадскіх чыноў, зноў выступіў, гэтым разам у якасці прадстаўніка Маршалкоўскай управы, Ян Сычэўскі. Прызнаўся ён, што калі пазнаёміўся са сваімі паўнамоцтвамі, пераканаўся, што добрая воля вельмі аддалена ад магчымасцей. Сродкі Маршалкоўскай управы выдзяляюцца бюджэтам і яны вельмі абмежаваныя: у мінулым годзе на ўсю культуру ў нашым ваяводстве было выдзелена ўсяго 64 тысячы злотаў. Магу толькі саромецца, сказаў ён, бо гэта менш чым мала, а заявак маем на два мільёны; такія ж абставіны і ў іншых ваяводствах. Супрацоўніцтва культурных устаноў Беластока з замежнымі суседзямі павінна будзе ладзіцца на аснове пагадненняў Беласточчыны з Гродзеншчынай, мяркуе Ян Сычэўскі.

Ежы Завіша з Міністэрства культуры паведаміў, што ў яго ведамстве працуе кантактны пункт „Культура 2000", які ад імя міністра займаецца афармленнем здабывання еўрасаюзных грантаў для патрэб культурных устаноў.

Аляксандр Вярбіцкі

Без фінансавых вырашэнняў

Члены сеймавай Камісіі па справах нацыянальных меншасцей 2 красавіка наведалі Супрасльскі мужчынскі манастыр і пераехалі ў Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім. Перад пасламі беларускія песні заспявалі дзяўчаты з вакальных калектываў „Журавінка" і „Дзявочыя ноткі". У час спаткання з прадстаўнікамі белліцэя і белгімназіі галоўнай тэмай дыскусіі стала прапанова выступлення Польшчы з Пражскага дагавору ў справе настрыфікацыі дыпломаў ВНУ. Дырэктар Зінаіда Навіцкая сказала, што для выпускнікоў Гайнаўскага і Бельскага белліцэяў, якія вучацца ў вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь, абазначала б гэта дадатковыя экзамены дзеля прызнання іх дыпломаў. Зараз многія з амаль 100 студэнтаў з Гайнаўшчыны і Бельшчыны, якія вучацца ў Беларусі, хочуць пераносіцца ў польскія навучальныя ўстановы. Аднак такія магчымасці вельмі абмежаваныя. Асобы, якія перанясуцца на вучобу ў польскія медыцынскія інстытуты, вымушаны паўтараць адзін год вучобы. Настаўніца Комплексу школ Валянціна Бабулевіч прасіла падтрымкі ў арганізаванні выездаў для настаўнікаў у Беларусь з мэтай дасканалення іх кваліфікацый. Звярнула яна ўвагу на недахоп дапаможнікаў для навучання беларускай мовы і сродкаў на падпіску дзіцячых часопісаў з Беларусі, якія раней дасылаліся ў Польшчу. Пасол Яўген Чыквін крытычна ацаніў выгляд „Зоркі", паясняючы, што дзяцей перастаюць цікавіць чорна-белыя часопісы. Не пагадзілася з ім Валянціна Бабулевіч, якая заявіла, што яе вучні цікавяцца артыкуламі з „Зоркі" і дасылаюць свае тэксты ў тыднёвік. Станоўча ацаніла супрацоўніцтва з „Зоркай" і арганізаваныя ёю „Сустрэчы", у час якіх бельскія вучні навучыліся пісаць артыкулы і маглі развіваць свае журналісцкія здольнсці. Прасіла памагчы наладзіць супрацоўніцтва з прадстаўнікамі іншых нацыянальных меншасцей у Польшчы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Паслы Камісіі па справах нацыянальных меншасцей у Гайнаўцы. Злева: Яўген Чыквін, Яўген Сачко (дырэктар ліцэя), Ежы Чэрвінскі, Мар'ян Кава, Браніслава Кавальска і Уладыслаў Рак

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Орлі дэлегацыя пазнаёмілася з рэгіянальным школьным музеем, кабінетам беларускай мовы і новай гімнастычнай залай, якіх будова часткова фінансавалася з бюджэту Міністэрства адукацыі. Перад парламентарыямі выступіў школьны калектыў і дэкламатары. Госцям з Варшавы паказалі беларускую нацыянальную вопратку і даўнія хатнія прылады працы. Пры нагодзе абеду госці наведалі новы школьны будынак Падставовай школы і Гімназіі ў Дубінах.

На сустрэчу з членамі сеймавай Камісіі на тэму адукацыі сярод нацыянальных меншасцей, арганізаваную ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прыбылі прадстаўнікі беларускай, украінскай і літоўскай меншасцей. Прысутны былі працаўнікі Міністэрства нацыянальнай адукацыі і спорту. Сабраныя ставілі многа пытанняў да прадстаўнікоў улады, але атрымлівалі станоўчыя адказы толькі на тыя, якія не патрабуюць дадатковай фінансавай успамогі пры іх рэалізацыі. Войты навакольных гмін не атрымалі дэкларацый наконт павелічэння ім асветнай субвенцыі, а прадстаўнікі невялікіх школ з літоўскай мовай навучання не дачакаліся заявы, што іх асветныя ўстановы атрымаюць ад міністэрства дадатковыя грошы. У час сустрэчы быў прадстаўлены афіцыйны пункт погляду Міністэрства нацыянальнай адукацыі і спорту ў справе студэнтаў, якія вучацца ў Беларусі. Польскія ўлады ў сувязі з намерам выступлення з Пражскага дагавору звярнуліся да Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь з прапановай падпісаць асобнае двухбаковае пагадненне аб прызнаванні дыпломаў ВНУ, але не атрымалі адказу. Не прадбачваецца хуткая адмена існуючага парадку і цяперашнія студэнты, якія вучацца ў Беларусі, не павінны апасацца несапраўднасці сваіх дыпломаў. Станоўчым рашэннем, якое павінна ўцешыць настаўнікаў і вучняў невялікіх вясковых школ нацыянальных меншасцей (да 42 вучняў), з'яўляецца пастанова Міністэрства адукацыі аб павелічэнні дадатку да субвенцыі з 20% да 50%. Пастанова прымалася з думкай аб невялікіх літоўскіх школах, якім пагражала закрыццё, але тычыцца таксама іншых нацыянальных меншасцей. Літоўцы, як адзіная нацыянальная меншасць, дамагаліся, каб можна было арганізаваць гімназічныя экзамены на іх роднай мове. Рашэння ў гэтай справе яшчэ не прынята і іх вучні ў час гімназічных праверак вымушаны карыстацца польскай мовай. Нядаўна ў Міністэрстве нацыянальнай адукацыі і спорту была прынята пастанова аб арганізаванні для вучняў ромскай меншасці заняткаў па роднай традыцыі, культуры і гісторыі. Аднак не прадбачваецца арганізацыя навучання роднай мове для гэтай нацыянальнай меншасці. Куратар асветы Зофія Транцыгер-Кочук заявіла, што ў нашым ваяводстве самыя складаныя ўмовы для арганізавання вучобы. У падляшскія школы трэба яшчэ перадаць некалькі дзесяткаў аўтобусаў. За апошнія 4 гады ў нашым ваяводстве ліквідаваных было каля 300 невялікіх школ. У гэтым годзе самаўрады запрапанавалі Кураторыі ліквідацыю чарговых 100 школ, але атрымалі дазвол на спыненне працы больш за 30 асветных устаноў.

Апошнім месцам, які наведалі паслы на Беласточчыне, быў Беларускі музей у Гайнаўцы. Многія даўнія прылады працы і ткацкія вырабы, якія госці ўбачылі на выстаўках у музеі, былі падобнымі да экспанатаў з Бельска-Падляшскага і Орлі. Новымі для паслоў былі выстаўка фатаграфій з Афона і сацрэалістычныя карціны з Леніным, якія часова паказваюцца ў музеі.

Аляксей Мароз

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

На З. Кшывіцкага аддаў свой голас В. Цімашэвіч, гайнаўскі дэлегат

Партыя! Як быць далей?

Владзімеж Цімашэвіч на падляшскім з'ездзе СЛД асцерагаў сваіх партыйных калег, каб не паўтаралі памылак Выбарчай акцыі Салідарнасць. А шэф камісіі этыкі Саюза праф. Марыя Шышкоўская — што дзеянні кіруючай сёння Польшчай і рэгіёнам групоўкі размінаюцца з грамадскімі чаканнямі.

У час II З'езда падляшскага СЛД быў выбраны новы старшыня. Стаў ім большасцю 45 галасоў ваявода Марэк Стшалінскі (Ломжа) і перамог у другім туры старшыню падляшскага сеймікa Збігнева Кшывіцкага (Беласток). Не стараўся перавыбрацца дэпутат Мечыслаў Чарняўскі, дагэтуль старшыня сеймавай камісіі фінансаў, а раней віцэ-старшыня клуба. Гэтак рашыўся яшчэ да г.зв. афёры з галасаваннем у Сейме ягонай карткай (у час калі сам быў адсутны па прычыне хваробы) над вотумам даверу да віцэ-прэм'ера Марка Поля. Гэтую справу шырока дыскутавалі ў кулуарах з'езда і гаварыў аб ёй сам зацікаўлены, якога выключылі з дэпутацкага клуба СЛД.

— Гэта звычай прыняты ў парламенце. Калега галасаваў за мяне без майго ведама, па ўласнай ініцыятыве. У гэтай кадэнцыі я напэўна не зракуся дэпутацкага мандата.

У сваю чаргу праф. Марыя Шышкоўская заявіла, што рашэнне аб выключэнні з клуба дэпутата Чарняўскага было занадта паспешнае, заўчаснае і крыўднае, а меў гэта быць матэрыял для дысцыплінавання клуба.

— Я разумею, што былі прадпасылкі, каб выдаліць калегу Чарняўскага з клуба, — пераконваў у сваю чаргу ў размове з журналістамі Владзімеж Цімашэвіч, міністр замежных спраў, гайнаўскі дэлегат на гэты з'езд. — Грамадская думка мела права спадзявацца ад групы, якая здзейсніла злачынства ў гэтай справе рашучых дзеянняў. Хуткае рашэнне дазволіла пазбегнуць у Сейме чарговай кампраметуючай, нікому непатрэбнай, нарады ў Сейме.

Дэлегаты найбольш месца прысвяцілі, аднак, выбару новага старшыні. Дабіваліся функцыі, апрача Збігнева Кшывіцкага і Марка Стшалінскага, сенатар Сяргей Плева і Войцех Сямёнак. Кшывіцкага падтрымоўвалі м.інш. беластоцкія і гайнаўскія дэлегаты, сярод іх В. Цімашэвіч, які, запытаны „Нівай" пра прычыну сваёй падтрымкі, сказаў:

— Гэта чалавек з вялікім палітычным вопытам, з адкрытай галавой.

На яго думку, пасля выбару З. Кшывіцкага (па прафесіі журналіст, нядаўна ў „Трыбуне"), у рэгіёне запанавала б своеасаблівая раўнавага: старшыня СЛД паходзіў бы з Беластока, маршалак Сеймікa Януш Кшыжэўскі — з Сувалкаў, а ваявода з Ломжы. Аднак, большасць дэлегатаў выбрала 56-гадовага ваяводу Стшалінскага, па прафесіі — ветэрынара, былога сакратара ВК ПАРП у Ломжы і ломжынскага ваяводу. У першым туры галасавання адпалі: Сяргей Плева (62 галасы) і Войцех Сямёнак (8 галасоў). Сакратаром Ваяводскай рады СЛД стаў Эдвард Беляк (Беласток). Раней дэлегат В. Цімашэвіч выказаўся „Ніве" аб кандыдаце Марку Стшалінскім:

— Гэта добры ваявода. У яго ўсе кваліфікацыі, каб кіраваць гэтым палітычным асяроддзем. Аднак, не скрываю гэтага, ваявода павінен быць ваяводам, маршалак — маршалкам, а старшыня партыі — старшынёй партыі. У кожнага з нас межы магчымасцей дзеяння. Было б добра, каб нам не прыпаміналіся вядомыя з былога сітуацыі, калі хтосьці стаў палітычным дзеячам, абвешалі яго рознымі функцыямі, як навагоднюю ёлачку цацкамі.

Сам ваявода гэтак тлумачыў з трыбуны магчымасць спалучэння пасады ваяводы з функцыяй старшыні партыі:

— Я не прыхільнік кабінетнага яднання партыі.

Падкрэсліў, што гэтае пытанне — справа ўмелага арганізавання працы. Спасылаючыся на будучыню рэгіёна, зазначыў:

— Не стварайма ідэалагічных бар'ераў. Найважнейшы — інтарэс Падляшша. Трэба пазбаўляцца балельшчыцкіх адносін, а пераходзіць да актыўнай дзейнасці.

Спробу дыскусіі над становішчам партыі ўсчалі В. Цімашэвіч і ломжынская дэлегатка М. Шышкоўская.

— Наш стыль не вельмі адрозніваецца ад нашых папярэднікаў, хоць бы ў падборцы людзей на пасады. Прыйшоў час канструктыўнай грамадскай камунікацыі, — прамаўляў міністр. А ў кулуарах дадаў: — Перш за ўсё трэба задумацца над прычынай спаду падтрымкі для СЛД, урада і шматлікіх яго самаўрадавых структур. Неабходна сумленна задумацца, наколькі нам удалося памяняць стыль выконвання ўлады, значыць, партыйнасць дзяржавы, легкадумныя адносіны да закону, талерантнасць у адносінах да хабарніцтва і паплечніцтва, зняважлівыя адносіны да высокакваліфікаваных людзей толькі таму, што яны не партыйныя дзеячы і не іхныя сыны. Трэба мець адвагу гаварыць аб праблемах і рабіць з іх вывады. У ваяводстве самае важнае — уваход Польшчы ў Еўрасаюз і падрыхтоўка да сродкаў, якія будуць плысці з ЕС.

Прафесар Шышкоўская асцерагала:

— Мы трывожна аднадумныя, што часта стварае від безыдэйнасці лявіцы.

І далей:

— Трывожыць мяне, што ў радах нашай партыі панує культ біялагічнай маладосці, няма павагі да старых дзеячаў СЛД.

Непрыемны асадак застаўся пасля выступлення шэфа аднаго з беластоцкіх гуртоў, Януша Абуховіча, які папракнуў Цімашэвіча ў тым, што той — член аднаго з варшаўскіх гуртоў, а з Падляшшам не мае нічога супольнага.

— Пытанне, ці ў мяне ёсць штосьці супольнае з Падляшшам, прычыняе мне вялікую прыкрасць, калега з тае самае партыі! — адказаў гайнаўскі дэлегат.

У праграме падляшскага СЛД, прадстаўленай на з'ездзе ваяводам Стшалінскім, на першым месцы апынулася неабходнасць супрацоўніцтва з суседнімі краінамі — Беларуссю, Расіяй і Літвой. Неўзабаве мае адбыцца рабочая сустрэча на тэму шчыльнага супрацоўніцтва прадстаўнікоў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей з уладамі ваяводстваў усходняй Польшчы — Вармінска-Мазурскага, Падляшскага, Люблінскага і Свентакшыскага. Адна з васьмі найважнейшых праграмных мэт Саюза — гарантаванне нацыянальным меншасцям Падляшша магчымасці развіцця роднай культуры і ажыццяўленне раўнапраўнасці ў грамадскім жыцці вернікаў усіх рэлігій. У кіраўніцтве рэгіянальных структур СЛД паявілася ідэя сарганізавання сустрэчы прадстаўнікоў падляшскіх меншасцей з меншасцямі з-за ўсходняй мяжы. Владзімеж Цімашэвіч сказаў нам, што магла б яна адбыцца праз паўтара месяца.

Мацей Халадоўскі

Багдад падае, кааліцыя — трымаецца

Самаўрадавая Самаабарона ў Беластоку

Ці гэта бунт вашай партыі супраць Лепэра? — пыталіся журналісты ў прадстаўнікоў „Самаабароны" ў Падляшскім сеймікy на адмысловай прэс-канферэнцыі, на якой тыя выказалі сваё права на самастойнае рашэнне заставацца ва ўладах і быць у кааліцыях з іншымі групоўкамі. З вялікім неспакоем іншыя самаўраднікі чакалі гэтага рашэння. І з вялікай палёгкай выслухалі заяву, падпісаную пяццю сябрамі „Самаабароны" — Даротай Галавенка, Янам Камінскім, Каролем Тылендай, Анджэем Кулешай і Антонам Ціхоцкім. Як заўважыў маршалак Януш Кшыжэўскі, гэтае рашэнне магло б зусім адмяніць сітуацыю самаўрада і яго ўправы на фоне рэгіёна. „На сёння не бачым іншай кааліцыі, як з СЛД і ПСЛ", — зазначылі самаўрадаўцы з „Самаабароны".

— Ужо некалькі дзён заўважаецца зацікаўленне Самаабаронай РП на Падляшшы. Звязана гэта з рашэннем Прэзідыума Краёвай рады Самаабароны РП, якая датычыць выхаду нашай партыі з кааліцый з СЛД-УП, ПСЛ на ўзроўні ваяводскіх сеймікаў, — адчытаў заяву падляшскіх самаўраднікаў Караль Тыленда. — Усе памятаем, з якімі цяжкасцямі „нараджалася" кааліцыя СЛД-УП-ПСЛ-Самаабарона. У лістападзе 2002 г. атрымалі мы дазвол і падтрымку цэнтра на ўтварэнне кааліцыі ў сённяшнім кшталце. Не знайшлі мы іншай альтэрнатывы, незалежна ад 30 дзён размоў. Не была гэта кааліцыя ані з любові, ані з развагі, а з любові да развагі. Пад чуйным вокам Генавефы Вісьнёўскай была спісана кааліцыйная дамова, а 30 лістапада была вылучана ўправа Падляшскага ваяводства: маршалак і член управы з СЛД-УП, віцэ-маршалак і член управы з Самаабароны, віцэ-маршалак з ПСЛ... Уклалі мы агромны высілак у працу над бюджэтам, які быў прыняты 24 сакавіка 2003 г. Кожны дзень узмацняем наша становішча з самаўрадамі гмін і паветаў. Добрае супрацоўніцтва з ваяводскай управай гэта чарговы доказ супольных стараннаў дзеля развіцця Падляшскага ваяводства. Ці трэба спалучаць Сейм, урад і сітуацыю ў краіне з Сеймікам, управай і сітуацыяй у ваяводстве? Клуб радных „Самаабароны" не пагаджаецца з такім мышленнем. Гэта ад нашых выбаршчыкаў, якраз з тэрыторыі нашага ваяводства, атрымалі мы мандаты даверу, ад нас патрабуюць добрага кіраўніцтва, паправы ўмоў жыцця, змяншэння беспрацоўя; асаблівай дапамогі патрабуюць сяляне з тэрыторыі ваяводства, дзе бяда з нэндзай стукаюць кожны дзень у дзверы іх гаспадарак. Палітычны скандал не можа быць мэтай дзеяння. Гэта штосьці зусім іншае — абарона інтарэсаў жыхароў вёсак, беспрацоўных, нават у форме блакадаў дарог, а што іншае — скандал для яго самога... Ці ў выпадку распаду кааліцыі і немагчымасці стварэння новай, будзе ў сілах наша беднае ваяводства арганізаваць новыя самаўрадавыя выбары ў Сеймік? Каму патрэбны палітычны балаган? Напэўна не жыхарам нашага ваяводства і нашаму клубу. Ёсць патрэба ў цяжкай працы і як найлепшай падрыхтоўцы да ўваходу ў Еўрасаюз і выкарыстання ўсіх шанцаў, якія стануць перад ваяводствам...

— Зазначаем, што мы гатовы пацярпець усе паслядоўнасці нашых рашэнняў, — заявілі сябры Самаабароны ў адказ на пытанне наконт „бунту супраць Лепэра". — Чалавечыя справы і дабро нашага ваяводства, давер нашых выбаршчыкаў наказваюць нам такое рашэнне. Зазначаем, што з нашага боку няма ніякага канфлікту з уладамі Самаабароны на ўзроўні Краёвай рады, павета ці гміны. Ад патрыятызму партыйнага важнейшы патрыятызм лакальны. Гэта не палітычныя шыльды збудуюць салідныя падставы рэгіянальнага развіцця, толькі канкрэтныя дзеянні.

— Гэта самаўрадаўцы пачынаюць рашаць аб рэгіёне, а не краёвыя, адміністрацыйныя ўлады, — заўважыў Збігнеў Кшывіцкі, старшыня Сеймікa. — Ствараецца новая якасць. Рашэнне сяброў з Самаабароны патрабавала ад іх і адвагі. Наша кааліцыя, якой удалося стварыць такі бюджэт, які дае шанцы выбрацца з задоўжанасці ваяводства (ёсць ужо вынікі), канкрэтная праца радных гэта вартасць для ўсяго ваяводства.

Міра Лукша

Сербалужыцкая нацыянальная меншасць у Нямеччыне

Сербалужычане — славянская этнічная група, пражываючая непасрэдна за паўднёва-заходняй мяжой Польшчы, у ландах Саксоніі і Брандэнбургіі. Частка іх продкаў у IV і V стагоддзях пакінулі Лужыцкую зямлю і перасяліліся на Балканы, ствараючы там пачаткі раннесярэднявечнай сербскай дзяржаўнасці. Сербы на Лужыцах перажывалі нават эпоху гітлерызму, хаця пры фашыстах сталі яны найбольш падазронай групай грамадзян III Рэйха. Як славяне, спазналі шматлікіх рэпрэсій, але перш за ўсё былі пазбаўлены магчымасці якога-небудзь развіцця свайго нацыянальнага жыцця. За карыстанне сербскай мовай гітлераўцы ссылалі ў канцлагеры.

1945 год стаў для нямецкіх сербаў сапраўдным вызваленнем. Саветы, дарэчы, успрымалі іх, згодна з праўдай, як праследаваную славянскую меншасць. Усур'ёз разглядалі нават прапанову сербалужычан аб далучэнні іх правінцыі да чэшскай дзяржавы. У Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы ў палове пяцідзесятых гадоў было іх больш за 80 тысяч. Пасля вайны атрымалі яны, яшчэ ад савецкіх улад, магчымасць арганізацыі свайго школьніцтва, культурных устаноў, мелі сваю Дамавіну — арганізацыю накшталт БГКТ. Шмат хто з нямецкіх сербаў ставаў членам камуністычнай партыі. Як беластоцкім палякам відавочныя былі сярод камуністаў беларусы, так бачылі сваіх сербаў мясцовыя немцы. Калі прааналізаваць нямецкую палітыку ў адносінах да сербаў і польскую ў адносінах да беларусаў, можна заўважыць шмат падабенстваў. Улады ГДР фармальна гарантавалі сербалужычанам усе свабоды нацыянальнага развіцця, але неафіцыйна спрыялі іх асіміляцыі. Абмяжоўвалі колькасць школ з сербскай мовай навучання, друк літаратуры на сербскай мове, а ў 1964 г. увялі абавязак пісаць бацькам заявы, калі хацелі яны вучыць дзяцей роднай мове. Колькасць школьнікаў, якія вучыліся сербскай мове скарацілася з 12 000 да 2 800 асоб. Такая палітыка працягвалася да 1989 г. Тады наступіў маланкавы працэс асіміляцыі гэтай меншасці і на працягу кароткага часу патраціла яна вялікі адсотак членаў свае этнічнай групы. На пачатку дзевяностых гадоў, у аб'яднанай Нямеччыне, сербалужыцкая супольнасць налічвала каля 60 тысяч асоб.

Асіміляцыі спрыялі таксама індустрыяльныя працэсы. На Лужыцкай зямлі адкрыты былі шахты бурага вугалю. На працу прыязджалі немцы з усяе краіны, а разам з імі — іх культура і традыцыі. Мешаныя сужонствы з немцамі сталі надта частымі фактамі ў жыцці гэтай славянскай супольнасці. Яны, як бачым гэта ў штодзённым жыцці на Беласточчыне, заўсёды ўзбагачаюць толькі нацыянальную большасць.

Сербалужычане ў большасці каталікі, немцы — пратэстанты. У камуністычнай Нямеччыне пад шыльдай змагання з кансерватызмам і клерыкалізмам улады абмяжоўвалі магчымасці адукацыі ксяндзоў, навучанне рэлігіі, а касцёлы пераўтваралі ў музейныя ўстановы. У выпадку меншасці царква заўсёды бывала фактарам запавольваючым асіміляцыйныя працэсы. Абмежаванне ролі Каталіцкага касцёла пазбаўляла нямецкіх сербаў тармазоў германізацыі.

Калі ўсходняя Нямеччына пасля аб'яднання з заходняй была далучана да Еўрасаюза, хутка пачалі мяняць заканадаўства ў справе нацыянальнай палітыкі ў адпаведнасці з еўрасаюзнымі нормамі. Сваё заканадаўства вымушаны былі памяняць перш за ўсё ландыі Саксоніі і Брандэнбургіі. З другога аднак боку былі адхілены ад улады тыя сербалужычане, якія знаходзіліся ў радах камуністычнай палітычнай эліты. Шмат хто з сербскіх дзеячаў, а нават святароў, былі абвінавачаны ў супрацоўніцтве з палітычнай паліцыяй Штазі. Мясцовыя немцы вельмі хутка апячаталі сваіх сербаў кляймом камуністаў, хаця самі нічым ад іх у гэтым плане не розніліся.

Новае еўрасаюзнае заканадаўства стварыла магчымасць усебаковага развіцця сербалужыцкай культуры. Выдаецца газета „Сербскія навіны", тыднёвік „Розгляд", адміністрацыя Саксонскага ланда гатова стварыць умовы для развіцця ўсіх формаў навучання на сербскай мове, на лакальным тэлебачанні працуе рэдакцыя, якая рыхтуе перадачы для гэтай меншасці, на хвалях радыё кожнага дня на двух каналах можна пачуць мясцовую славянскую мову. У горадзе Будзішыне знаходзіцца Сербскі інстытут, які вядзе навукова-даследчыцкую дзейнасць па гісторыі і культуры гэтай грамадскасці. Працуе ў Інстытуце каля 50 вучоных. У гэтым горадзе знаходзіцца таксама Сербскі дом, які выконвае функцыю рэгіянальнага цэнтра культуры. Тэатр, вакальныя і танцавальны калектывы ствараюць умовы для рэалізацыі ўсіх культурных патрэб гэтай грамадскасці. Культурная, асветная і навуковая дзейнасць фінансуецца дзяржавай.

Знакамітыя ўмовы для развіцця нацыянальнага жыцця не стрымалі аднак асіміляцыйных працэсаў. Сербскай мовай у хатнім ужытку карыстаюцца найчасцей толькі пажылыя людзі. Моладзь амаль выключна размаўляе па-нямецку. Каб уладкавацца, неабходна вывучыць нямецкую мову. Таму германізацыя наступае ў апошніх гадах спантанна і без ніякага ціску звонку. З другога боку ў Сербскім інстытуце і тэатры працуе шмат немцаў, якія ведаюць мову сваіх славян і падтрымліваць усялякую дзейнасць, спрыяючую захаванню адметнасці сваіх суседзяў.

Дэмакратыя прынесла на Лужыцкую зямлю таксама патрэбу змагання за ўладу. Аднак сербаў надта мала, каб самастойна выбраць сваіх кандыдатаў у парламент мясцовага ланда, ці тым больш дзяржавы. Як вядома з беластоцкага панадворка, большасць ніколі не аддае сваіх галасоў на кандыдатаў меншасці. Адваротны працэс бывае нормай. У камуністычную эпоху было нашмат прасцей. Дэпутаты проста назначаліся. Тады заўсёды было месца для лужыцкіх сербаў, хаця камуністы не дазвалялі ім дэманстраваць сваю адметнасць. Калі з'явіліся ўмовы для ўсебаковага развіцця нацыянальнага жыцця аказалася, што няма каму пакарыстацца гэтымі магчымасцямі.

Яўген Мірановіч

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў" друкуем чарговы тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жараб'ёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

Projekt wydawniczy zrealizowano przy współpracy z Urzędem Komitetu Integracji Europejskiej w ramach konkursu otwartego dla mediów-2003.

5 конкурснае пытанне

У якім горадзе знаходзіцца Сербскі інстытут?

Адказ: .....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 27 красавіка 2003 г.)

Узнагароды...

... за правільны адказ на ***2-ое конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Канстанцін Белюк** з Сідаркі, **Казімір Радошка** са Свебадзіцаў і **Лявон Федарук** з Рыбалаў. Узнагароды дашлем па пошце.

Рэйтынг ліцэяў

„Выбарчая газета" і Кураторыя ў Беластоку ў палове сакавіка абвясцілі вынікі рэйтынгу агульнаадукацыйных ліцэяў. Перамог у ім III Агульнаадукацыйны ліцэй у Беластоку. Шостае месца заняў Агульнаадукацыйны ліцэй з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайцаўцы, а адзінаццатае — II Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім. I Агульнаадукацыйны ліцэй у Бельску-Падляшскім апынуўся на трынаццатым месцы.

— Высокае месца ў рэйтынгу, гэта заслуга, перад усім, вучняў і настаўнікаў. Ёсць надзея, што дасягненні нашага ліцэя прыцягнуць яшчэ больш выпускнікоў гімназій у нашу школу, — мяркуе дырэктар Яўген Сачко. — Аднак удзел у рэйтынгу не з'яўляецца мэтай нашай працы. У цэнтры нашай увагі ставім вучня. Калі добра складаецца супрацоўніцтва паміж настаўнікамі, вучнямі і бацькамі, тады ствараецца прыхільная атмасфера да працы. Дасягненні вучняў нашага ліцэя з'яўляюцца вынікам гэтага супрацоўніцтва.

У катэгорыі „поспехаў школы" высокія месцы занялі белліцэі з Гайнаўкі (трэцяе) і Бельска (шостае). Найбольш балаў атрымлівалі школы за дасягненні ў алімпіядах. Гайнаўскі белліцэй, як і найлепшы ў ваяводстве III Агульнаадукацыйны ліцэй у Беластоку, можа пахваліцца 4 лаўрэатамі і 7 фіналістамі прадметных алімпіядаў. Толькі на 1 фіналіста менш у Бельскім белліцэі. Менш балаў атрымалі вучні з белліцэяў за ўсе міжшкольныя конкурсы, хаця сярод іх самымі частымі з'яўляюцца спартыўныя спаборніцтвы. Камісія ацэньвала гімназістаў паступаючых у ліцэі паводле іх поспехаў у прадметных конкурсах, вучобе і экзаменах. Звяртала ўвагу на пазашкольную работу і дзейнасць у галіне турызму. У абодвух беларускіх ліцэях дзейнічае многа прадметных гурткоў зацікаўленняў, клубы спраў беларускіх і польска-беларускіх, спартыўныя і тэатральныя гурткі. У Бельскім ліцэі дзейнічае гурток народнага рукадзелля, правоў чалавека, дэкламатарска-тэатральны і клуб прадпрымальніцтва. У Гайнаўскім белліцэі працуюць „Агенда 21", мастацкі, еўрапейскі, інтэрнэтавы і бібліятэчны гурткі. У абодвух ліцэях дзейнічаюць вакальныя калектывы — „Знічка" і „Дзявочыя ноткі". Гайнаўскі белліцэй можа пахваліцца вельмі добрымі ўмовамі вучобы. Побач новапабудаванага школьнага будынка знаходзіцца новая вялікая гімнастычная зала. Ліцэісты могуць карыстацца 2 новаабсталяванымі камп'ютэрнымі заламі. У Бельскім белліцэі таксама добрыя ўмовы для вучобы, але дзеля правядзення спартыўных спаборніцтваў — горшыя. Па 80% вучняў Гайнаўскага і Бельскага белліцэяў паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

— Для мяне самымі важнымі ў рэйтынгу былі дасягненні ліцэя ў конкурсах, алімпіядах, вынікі экзаменаў на атэстат сталасці і поспехі вучняў на экзаменах у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Найважнейшая задача школы — падрыхтоўка вучняў да далейшай вучобы, — заяўляе дырэктар Гайнаўскага белліцэя Яўген Сачко.

— У тым, што наш ліцэй заняў крыху слабейшае месца, чым у мінулых гадах, не бачу я ніякіх пагроз на будучыню. Школа не панізіла ўзроўню навучання. Меншымі былі дасягненні ў прадметных алімпіядах і таму набралі мы менш балаў. Вынікі экзаменаў на атэстат сталасці не былі ў нас слабымі. Сярэдняя ацэнка склала каля 4. Можа крыху слабейшымі ў вучобе былі мінулагоднія выпускнікі і таму менш іх паступіла ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, — ацэньвае вынікі Бельскага белліцэя дырэктар Зінаіда Навіцкая.

Аляксей Мароз

Зорка
старонка для дзяцей

Роднае слова 2003

Нараўка, Дом культуры, 7 красавік 2003 года.

Сцэна, на якой выступалі дэкламатары „Роднага слова", была прыаздоблена цытатай з верша Ларысы Геніюш:

Мова родная, мова дзядоў!
Іншай мовы мы сэрцам не чуем
Мілагучнасць любых нам слоў
Быццам музыкай сэрца чаруеш

— Сёння мінае якраз 20 гадоў ад смерці беларускай паэтэсы, Ларысы Геніюш, — адзначыла дэкламатарка Наталля Швед з Беластока. Вершы паэткі дэкламавалі таксама Магдаліна Чыквін з Гайнаўкі і Аляксандра Бяляўская з Нараўкі.

Цікавая падброка сёлетняга рэпертуару. Амаль усе гімназісты дэкламавалі патрыятычныя творы. Сярод аўтараў сустракаем Арсенневу, Гаруна, Караткевіча, Геніюш, Арла. **Гран-пры** і ўзнагароду пасла РБ атрымала **Марта Неліпінская** з бельскай „тройкі" за верш Наталлі Арсенневай „Куды".

У катэгорыі I-III класаў гімназіі выступілі 24 асобы. Самую вялікую колькасць дэкламатараў падрыхтавала тут бельская „тройка".

Камісія ў саставе: **Тамара Русачык** (старшыня), **Яніна Плютовіч** і **Вольга Сянкевіч** вылучыла пераможцаў:

Гран-пры:

— **Марта Неліпінская** — Гімназія н-р 3 у Бельску-Падляшскім. (Марта атрымала радыёмагнітафон уфундаваны паслом РБ у Польшчы Паўлам Латушкам.)

I месца:

— **Магдаліна Чыквін** — Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы,

— **Уршуля Ігнацюк** — Гімназія ў Нараўцы,

— **Юліта Шчурак** — Гімназія н-р 3 у Бельску-Падляшскім.

II месца:

— Эва Мароз — Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы,

— Аляксандра Бяляўская — Гімназія ў Нараўцы,

— Анна Дзмітрук — Гімназія н-р 3 у Бельску-Падляшскім.

III месца:

— Марта Насковіч — Гімназія н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— Юстына Вышкоўская — Гімназія ў Ягуштве,

— Паўліна Савіцкая — Гімназія ў Гарадку,

— Кася Верамяюк — Гімназія н-р 3 у Бельску-Падляшскім.

Вылучэнні:

— Барбара Жэрунь — Гімназія н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— Марыёля Герман — Гімназія н-р 2 у Гайнаўцы,

— Анна Іванюк — Гімназія ў Нарве,

— Івона Рамановіч — Гімназія ў Чыжах,

— Мажэна Пушкарэвіч — Гімназія н-р 3 у Бельску-Падляшскім.

* * *

Традыцыйна найбольшую групу дэкламатараў склалі вучні пачатковых школ. У катэгорыі 0-III класаў было 36 асоб. І тут самую вялікую групу складалі навучэнцы ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім. (Не даехалі дзеці з Рыбалаў, Храбалоў, Кляшчэляў і Дубін).

Цікавая з'ява — у падборцы рэпертуару сярод дзяцей найбольш вершаў было пра здароўе і дактароў! Тры разы прагучэў верш Эдзі Агняцвет „Доктар смех".

Са сцэны прагучалі вершы Дзеружынскага, Вольскага, Шушкевіча, Шведа, Галіноўскай, Тарас, Пазнякова, Жуковіча, Муравейкі, Віткі, Крапівы. Падборка была разнавіднай. Найбольш цікавы рэпертар паказалі школьнікі з Орлі. Наймалодшымі ўдзельнікамі былі дашкольнікі з Беластока, іх прывезлі ў Нараўку бацькі.

Вось спісак узнагароджаных:

У катэгорыі 0-III класаў:

Гран-пры:

— **Адам Адзіевіч** — ПШ у Орлі.

I месца:

— **Барбара Шусцік** — ПШ у Семяноўцы,

— **Наталля Лаўранюк** — ПШ н-р 3 у Бельску-Пдляшскім,

— **Мартына Барташук** — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— **Рыгор Красоўскі** — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім.

II месца:

— Дамініка Юшкевіч — ПШ у Нарве,

— Наталля Семянюк — ПШ у Чыжах,

— Аляксандра Сцепанюк — ПШ н-р 4 у Беластоку,

— Іаанна Хмялеўская — ПШ н-р 11 у Беластоку.

III месца:

— Ганна Пякарская — ПШ н-р 4 у Беластоку,

— Матэвуш Магрук — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— Агнешка Рэпнік — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— Марта Вайцюк — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім.

Вылучэнні:

— Яна Латушка з Варшавы (Янка атрымала ўзнагароду старшыні БГКТ — Яна Сычэўскага),

— Эва Герасімюк — ПШ у Арэшкаве,

— Пётр Герасімюк — ПШ у Арэшкаве,

— Эдыта Наўроцкая — ПШ у Дубічах-Царкоўных,

— Марыя Масальская — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— Эва Шкода — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— Аляксандра Заборская — ПШ н-р 4 у Беластоку,

— Міхась Саковіч з Самаўрадавага прадшколля н-р 14 у Беластоку,

— Габрыся Цыванюк з Самаўрадавага прадшколля н-р 22 у Беластоку.

* * *

У катэгорыі IV-VI класаў таксама дамінавала тэма здароўя і лекараў. Тут найцікавей выступіў Беласток, які вылучаўся тэатральнасцю выступленняў:

Гран-пры:

— **Наталля Кандрацюк-Свярубская** — ПШ н-р 4 у Беластоку.

I месца:

— **Мартына Валерыян** — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— **Вольга Яканюк** — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— **Аляксандра Каліна** — ПШ н-р 4 у Беластоку,

— **Наталля Швед** — ПШ н-р 4 у Беластоку.

II месца:

— Кацярына Кузьміч — ПШ у Гарадку,

— Арак Шайкоўскі — ПШ у Орлі,

— Эмілія Шклярук — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— Марта Матысюк — ПШ у Семяноўцы.

III месца:

— Аліцыя Міранчук — ПШ у Нарве,

— Аляксандра Лаўранюк — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— Мацей Карчэўскі — ПШ н-р 4 у Беластоку,

— Міхал Хмялеўскі — ПШ н-р 11 у Беластоку.

Вылучэнні:

— Магдаліна Саковіч — ПШ н-р 4 у Беластоку,

— Эвеліна Бяроза — ПШ у Орлі,

— Эміль Жэпка — ПШ у Ягуштове,

— Тамаш Таранта — ПШ н-р 3 у Бельску-Палдяшскім,

— Юліяна Дораш — ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

— Анна Раманюк — ПШ у Новым Корніне,

— Марцін Мішчук — ПШ у Арэшкаве,

— Магда Дудзіч — ПШ у Нарве.

Лаўрэаты Гран-пры, у якасці ўзнагарод атрымалі радыёмагнітафоны, іншыя — пісьмовыя наборы, фламастэры, адукацыйныя гульні. Трэба адзначыць, што ў гэтым годзе перамаглі вядомыя ўжо дэкламатары, лаўрэаты мінулых гадоў. Сярод выступаючых не паказаліся новыя таленты.

Арганізатары — БГКТ адзначылі, што конкурс мае 32-гадовую традыцыю.

Ганна Кандрацюк

Польска-беларуская крыжаванка № 16

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 12: Ас, ліса, вербніца, чарапаха, акула, раса, Юры, дотык, рэстаран. Кот, вечар, абрус, налада, ліпа, юта, сахарын, фанатык.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Эвеліна Прабуцкая**, **Лукаш Гайдук** з Нарвы, **Барбара Якубюк** з Гайнаўкі, **Матэвуш Тамашук**, **Міхал Герасімюк** з Новага Корніна, **Іаанна Галёнка**, **Альжбета Антанюк** з Арэшкава, **Міхал Паплаўскі**, **Магдаліна Крыстасюк** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Конкурс вялі Аня і Міхась з Нараўкі

Дэкламатары Міхась і Магда Саковічы з Беластока прыехалі з бацькамі

Марта Неліпінская, III клас Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім, дэкламавала верш Н. Арсенневай „Куды"

Наталля Кандрацюк-Свярубская, IV клас ПШ н-р 4 у Беластоку, дэкламавала верш П. Макаля „Воўк і ліса"

Яна Латушка дэкламавала верш Э. Агняцвет „Зямля з блакітнымі вачыма" і „Вясенняя раніца" М. Чарота. Вылучэнне і ўзнагарода старшыні ГП БГКТ

Адась Адзіевіч, III клас ПШ у Орлі. Дэкламаваў верш У. Ліпскага „Дзелавы шафёр"

Мартына Барташук з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім. Дэкламавала верш С. Шушкевіча „За платамі на грудзе" і атрымала I месца

Фотарэпартаж Ганны Кандрацюк

Дэкламатары ў Нараўцы

7 красавіка 2003 г.

Марыся Масальская з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім. Дэкламавала верш А. Пысіна „Пайшоў коўзацца каток" і атрымала вылучэнне

Першая злева Дамініка Юшкевіч з Нарвы. Лаўрэатка II месца „Роднае слова 2003"

Арганізатарка — сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч і Яніна Плютовіч — член журы конкурсу абдароўваюць лаўрэатаў

Скульптар з Кляшчэляў

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

У галерэі Славаміра Смыка

Нарадзіўся ў Дабрывадзе. Па прафесіі ляснік. Па захапленні — скульптар-аматар. Жыве і працуе ў Кляшчэлях. Шэсць гадоў таму збудаваў дом. Вольны час праводзіць у майстэрні...

— Раблю сабе, не для славы ці любіцеляў, — сказаў, калі ішлі мы ў майстэрню. — Хачу, каб скульптуры былі зразумелымі сярэдняму чалавеку, бо сябе такім лічу.

Славаміру Смыку, бо аб ім тут гаворка, сорак пяць гадоў. З натуры чалавек ён сціплы. Не любіць хваліцца. Ад дзяцінства назірае прыроду. Захапляецца натурай, асабліва лесам, з якім звязана прафесійная і скульптурная праца. З-пад яго долата выходзяць абстрактныя фігуры жанчын.

— У вобразе жанчыны бачу прыгажосць чалавечай душы, — гаворыць скульптар. Адчуваецца гэта тады, калі кранаеш рукою скульптуры. Адны далікатныя гладкія лініі. Ніводнай рысы долата...

— Пры разьбе найбольш карыстаюся цвёрдым дрэвам з выразнымі слоямі. Для гэтага найлепш падыходзіць дуб, яблыня, ясень, лістоўніца. Мае фігуры пахнуць натурай. Не карыстаюся штучнымі фарбамі, адно воскам і шкіпінарам.

Для скульптара, калі бярэ дрэва для апрацоўкі, гэта не звычайнае бервяно, але жывая расліна, якую намагаецца ажывіць.

— Няма двух аднолькавых дрэў, — сцвярджае скульптар. — Так і з маімі фігурамі справа маецца. Няма разьбы дасканалай, бо не мела б сэнсу далейшая праца. Чалавек імкнецца ўперад. Шукае чагосьці новага, непаўторнага. Вось прыклад. Збудаваў дом. Затым яго ўпрыгожваю. Адчуваю ў гэтым сілу і сэнс жыцця.

Славамір Смык арганізаваў шматлікія выстаўкі. Ягоныя працы знаходзяцца ў белавежскай гасцініцы, у многіх гарадах краіны і за мяжою: у Ватыкане, Галандыі, Нямеччыне, Вялікабрытаніі, Расіі, Францыі ды іншых прыватных галерэях. Для арганізавання такіх мерапрыемстваў неабходныя фінансавыя сродкі. У лесніка-скульптара з Кляшчэляў іх не хапае. Дзякуючы Інфармацыйнаму цэнтру дзяржаўных лясоў, быў выдадзены каталог скульптур мастака (тыраж 1 500 экземпляраў), а пры ўспамозе дацкага фонду DANCE і павятовага старостваў Гайнаўцы была арганізавана хатняя галерэя, якую зараз наведваюць турысты. Для Кляшчэляў гэта не абы-які атракцыён.

— Якія планы на будучыню?

— Рыхтуюся да з'езду скульптараў у Галандыі, які назначаны на 12 ліпеня-3 жніўня г.г., — гаворыць суразмоўца. — Праўдападобна адкрые яго член каралеўскай сям'і. Навосень збіраюся ў Гамбург, у Нямеччыну. А зараз хачу адпачыць і заняцца сям'ёю.

Уладзімір Сідарук

Новыя ruskie „Карткі"

У суботу 5 красавіка ў беластоцкую кавярню „Фама" на прамоцыю новага — 29 нумара літаратурна-мастацкага часопіса „Карткі" — паявіўся тлум. І хоць пачалося тое прадстаўленне паказам танцаў тутэйшых індзейцаў (не з нашага запаведніка), без выступлення нейкага прыцягальнага для слухачоў гурту, а з трыма фільмамі, ёсць гэты нумар перш за ўсё беларускі, у значэнні „тутэйшы", бо не кожны з аўтараў, нават калі ён на *-ук/-юк* канчаецца, прапаведуе сваю нашасць. Мала, што герой у новым нумары часопіса гэта Юры Гумянюк (інтэрв'ю ўзяў у яго сам галоўны рэдактар Багдан Дудко, родам з Цісоўкі ў Міхалоўскай гміне), вершы героя былі ў перакладах трох нашых беларусак — Ганны Кандрацюк, Міры Лукшы і Аліны Ваўранюк, паявіліся два апавяданні Ганны Кандрацюк у перакладзе Міры Лукшы і Гражыны Харытанюк (гэта, як здаецца, самы моцны момант часопіса, які выпраменьвае сваё святло на рэшту старонак-картак), у якіх выступаюць тутэйшыя героі і месцы, ёсць эсэ прафесара Уладзіміра Паўлючука (колішняга „ніўца") пра цнатлівае жыццё, польскія вершы маладога Мар'юша Кас'янюка з Гайнаўкі, у Галерэі „Картак" — кідкія ў вочы карціны Адама Сяменчыка з Гарадка (пра яго выказваюцца нават французы)... Да таго ўсяго Алесь Максімюк усё тое акуратна аформіў эдытарска, а друкаваліся — традыцыйна — „Карткі" ў „Ортдруку". Адным са спонсараў выдання быў Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь...

Раскрываю верш у кніжцы *Спалучэнні* М. Кас'янюка *Гайнаўка* — кніжка прыкладзена да новага нумара часопіса.

Кажуць, будзе тут запаведнік
Бізоны пасярод мястэчка
Індзейцы віно тут віно там
Малы фіат Вялікі брат
Цыфравыя думкі
Нулёў і адзінак хапае спераду
У чарзе па купон у тота-палёт
Іргаюць у рулетку шэсць стрэлаў
Усе патроны сляпыя рускія
Vodka папяросы спірт



Варта фабрычнай аплаты па raty
Перажоўваныя ў вуснах як праклён
Папяровае zło to
Частае ў струмянях размоў нашых...

„Карткі", што, як няраз мы чулі, недаспадобы нашым грошаразмеркавальнікам. Быццам замнога дае Дудко, які „невядома які па нацыянальнасці" (тутэйшы католік), тых беларусаў (да таго такіх, якія сябе такімі ясна акрэсліваюць), рускіх, рускіх жыдоў... Што вычвэрныя малюнкі „тае Валкавыцкай" не менш абражаюць паняў з правае ўправы горада як „непрыстойныя абразкі" з „Арсенала". Што „карткаўцы" трымаюцца з тымі з Сейнаў, „ад жыдоў". А гэта — наша Еўропа, хоць „свет на абочыне". А на абочыне ён не ёсць.

„Карткі" — вядомы ва ўсёй Польшчы часопіс. А чытаюць яго шмат дзе. Два нумары назад з Гамбурга прыйшоў допіс па Інтэрнэце — ён жа, як павута, яднае ўвесь зямны шар — Ганне Кандрацюк. Азваўся... віртуальны герой яе апавядання „Блакітны квадрат" — несумненнага пункту цяжкасці папярэдняга нумару. Там было і пра нашага беларускага птаха, бусла. *Pełny odlot!*

„Карткі" можна набыць у кнігарні „Акцэнт" па вул. Рынак Касцюшкі ў Беластоку і ў рэдакцыі „Нівы". А тая беларускасць („ruskość") яшчэ не спадабаецца — і гэта мус — нашым усёведным аглядальнікам-рэцэнзентам па культуры.

Міра Лукша

Багровы цень Віктара Стахвюка

Віктару Стахвюку *zbrydło viyeryti u raj, які чужынцы вычвараюць у нашым садзе.* Гэты дынамічны чалавек, непаседлівы (ды не мітуслівы), філолаг, бізнесмен, *bon vivant* ды душа кампаніі, выражае сябе ў розны спосаб. Раз ён неблагі мастак, у іншы — паэт. А з вершаў вызірае іншы чалавек — часам яму з безнадзеяй апускаюцца рукі, калі ідзе сізіфавым шляхам: *жыву // з укрыжаванай надзеяй // з якой абсыпаюцца // бязглузда наклееныя мроі // калі // мутнее іх фіялкавы колер // які // ўжо // непатрэбны // адвечнай раніцы // што адчыняе дзверы // у шэрае // неба // дня // іду // спатыкаючыся аб яго крохі // за хлебам надзённым // ён вырастае за арарататавай гарой.*

Кніжачка *Багровы цень** — сорак першая ў серыі Бібліятэкі Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа", а першая ў літаратурнай кар'еры аўтара, які дэбютаваў маладым хлопцам у „Ніве". І першая ў гісторыі „Белавежы", у якой вершы друкуюцца паралельна на беларускай мове (ёсць 7 напісаных аўтарам па-беларуску) і на роднай гаворцы Стахвюкоў з вялікай старажытнай вёскі Трасцянкі. Запісаны яны лацінскім алфавітам, з зазначэннем моўных асаблівасцей тае *руської* гаворкі. Віктар Стахвюк даўно мог бы выдаць кнігу, і па-беларуску, і, таксама на радзіннай мове, нават калі б увесь свет не даваў яму гэта зрабіць — больш настойлівага і напорыстага, да таго пераканаўчага чалавека рэдка дзе знойдзеш. А, можа, і не вельмі яму хацелася?.. Па дарозе кім ён не быў — зведаў усё прагна і ў высях, і пад вадой (клуб вадалазаў!), займаўся і педагагічнай працай, і радыё, грашыма, нават і палітыкай, паспеў і дзедам стаць, і тут раптам — незатоўстая кніжачка, аздобленая таксама ягонымі малюнкамі, а моцы ў ёй колькі! Вершы гучаць на беларускай літаратурнай мове выдатна („пераўвасабілі іх на літаратурную мову сябры"), на трасцянніцкай гаворцы — пульсуюць такой моцай, што, чытаючы, быццам бачыш фіялетавую душу гэтага неардынарнага творцы...

... No ja vernuś
nebo naściež odczyniu
tam pamet' pradiduw najdu
wnesu u chram
de tron terniovy
ukojit stomlanu duszu
słovom
diedovoji movy.

Міра Лукша

*Віктар Стахвюк, *Багровы цень*, Беласток 2002, сс. 44.

„Гліняны Вялес" знайшоў гаспадара

Прэмію Таварыства Вольных Літаратараў (ТВЛ) „Гліняны Вялес" за выдадзеную летась кнігу „Практычны дапаможнік па руйнаванні гарадоў" атрымае мінскі літаратар Альгерд Бахарэвіч.

Штогадовая літаратурная прэмія ТВЛ у выглядзе глінянай статуэткі паганскага бога плоднасці Вялеса ўручаецца за найбольш арыгінальныя дасягненні ў галіне беларускай мастацкай літаратуры, якія рэалізаваліся аўтарам у выдадзенай кнізе. Прэміяй „Гліняны Вялес" у розныя гады ганараваліся Ігар Бабкоў, Алесь Разанаў, Славамір Адамовіч, Уладзімер Арлоў, Лявон Вашко, Сяргей Астравец ды іншыя вядомыя пісьменнікі.

Сёлета на атрыманне „Глінянага Вялеса" намінаваліся кнігі пяці аўтараў. З іх тры набралі большасць галасоў сярод рэспандэнтаў. У фінальным змаганні з Леанідам Дранько-Майсюком і Зміцерам Бартосікам, дзякуючы ўсяго аднаму голасу, пераможная шаля схілілася ў бок Альгерда Бахарэвіча і ягонага „Практычнага дапаможніка па руйнаванні гарадоў". Свой літаратурны шлях Альгерд пачынаў у групе „Бум-Бам-Літ", а празаічныя творы, змешчаныя ў ягонай кнізе, друкаваліся ў часопісах „Калосьсе" і „Nihil".

Інаўгурацыя Альгерда Бахарэвіча пройдзе традыцыйна 8 мая ў Музеі кнігадрукавання ў Полацку. Якраз у гэты дзень Таварыства вольных літаратараў адзначае свой 10-гадовы юбілей!

Людвік Сарока

Ішлі два кіламетры з запаленай свечкай

Найстарэйшае гэта і найважнейшае хрысціянскае свята — Вялікдзень. Спрадвечны ўзнёслы рытуал пераплятаецца тут з сакралізаванымі традыцыяй абрадамі ў дасвяточны перыяд. Многія з іх — раней і сёння — з'яўляюцца выдатнай нагодай для маладзёжных гульняў: тапленне Маранны — сімвала зімы і смерці, гульня на выбіткі крашанкамі ці смігус-дынгус. І нічога няма тут дзіўнага, бо Вялікдзень з'яўляецца святам радасці і трыумфу. Кожны з чарговых дзён Вялікага тыдня меў і захоўвае сваю афарбоўку і характар, абумоўленыя спадчынай абрадаў вырастаючых спакон вякоў. Чым бліжэй да Вялікадня, тым больш бадзёрасці ўступала ў людзей.

Як пасля светлага дня наступае цёмная ноч, так пасля радаснага карнавалу няўхільна прыходзіў сумны і суровы пост. Пра пасхальныя радасці ў Крывой пры санацыі і сёння расказваюць Анна Асіпюк і яе дачка Лідзія.

— Ці калісь людзі пасцілі дзеля ашчаднасці? Калісь пост быў сапраўды суровы, асабліва ў адносінах да ежы і ўсяго таго, што дастаўляла чалавеку пустую радасць. Нельга было свістаць, гуляць, спяваць і танцаваць ды і ўцехі ў пасцелі — у сужонствах — моцна абмяжоўваліся або і зусім забараняліся. У тыя дні чалавек меў думаць не пра раскошы, але пра тое, як з праху паўстаў і ў прах вяртаўся — меў задумоўвацца пра марнасці гэтага свету.

Зімою і ранняй вясной каморы і свірны не ва ўсіх пуставалі, але не на ашчаднасць тады быў націск, але на адцягненне чалавечых думак ад тленнага жыцця ў бок душы, Бога, неба. Бывала, што некаторыя людзі тайком пад'ядалі тлустыя кусочкі. Дзетвара і моладзь закрадваліся ў каморы, бо сапраўды цяжка было вытрываць шасцітыднёвы пост.

У нашай сям'і ў час посту елі густа звараны гарох з халадніком, бульбу ў лупінах, галкі з алеем і цукрам, грэцкую кашу, змеленае проса натоўчанае ў бульбе. Пра яйкі не было гаворкі, а дзецям гаварылі: калі з'ясі яйка, то і зб'еш; значыць паб'еш палец на назе, бо хадзілі басанож. Помню таксама, як спявалі ў той час „Завтра Воскресение":

Нашы блінчыкі пякуць
І памажуць, і пакажуць,
А пакушаць не дадуць.

Велікодныя ўрачыстасці пачыналіся ад Пальмавай нядзелі, Вербніцы — на памяць трыумфальнага Гасподняга ўезду ў Іерусалім у нядзелю перад Яго пакутамі. У нас заміж пальмавых ветак ужываюцца галінкі зелянеючых дрэў, найчасцей вярбы, адтуль і назва „Вербніца". Пасля пасвячэння пальмаў у царкве людзі вярталіся дамоў, ударалі хатнікаў вярбовай віткай, прыгаворваючы:

Вярба б'е, не я б'ю,
За тыдзень Вялікдзень,
За шэсць ноч Вяліканоч,
Не ўсікайся, не ўсірайся,
Будзь здаровы як вярба,
Будзь бягучы як вада.

Пасвенчаныя ў царкве пальмы затыкалі дома за ікону і трымалі іх там да наступнага Вялікадня. Паводле павер'яў яны ахоўвалі гаспадарку ад грому. Людзі верылі, што вярбовыя коцікі з пасвенчанай пальмы прыносяць здароўе і давалі іх жывіне разам з кормам, каб не хварэла, а выганяючы першы раз на пашу ўдаралі кожную жывёлу пальмай, на шчасце.

Перад Вялікаднем упрыгожвалася хаты ўсярэдзіне. Дзеля гэтага ўжывалі парэзаную ў вузкія палоскі каляровую паперу. Скручвалі іх і развешвалі ў выглядзе павука.

У апошні дзень Вялікага посту свяцілі пасху: у начоўку, высцеленую белым абрусам, клалі кумпяк, яйкі, мазурку, бабы — усё гэта стаўлялі на вуліцы перад сядзібай. Свяцоныя яйкі з'яўляюцца найважнейшай стравай святочнага снедання, бо займаючы месца пры стале дзелімся менавіта яйкам, выказваючы пажаданні.

Моладзь у святочныя дні забаўлялася качаннем яек і выбіванкамі. Яйкамі абдорвалі знаёмых. У панядзелак мужчыны аблівалі вадой жанчын, а ў наступныя дні, да Тройцы, жанчыны мужчын. Кажуць у народзе, што гэты „дынгус" завёўся ў Іерусаліме, дзе яўрэі аблівалі вадой хрысціян, якія гутарылі пра ўваскрасенне, каб разагнаць іх і прыцішыць іх размовы. Іншыя мяркуюць, што ўзяўся гэты звычай у час увядзення хрысціянства, калі святары, не могучы ахрысціць вялікай колькасці язычнікаў паасобку, заганялі натоўп у ваду.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Анна Асіпюк з дачкой Лідзіяй

Верыць можна, як каму падабаецца, — канчае свой успамін спадарыня Анна, а яе дачка Лідзія дадае:

— Сёння звычай свячэння змяніў сваю форму і набыў сімвалічны характар. Прадукты для свячэння кладуць у віклінавы кошычак, выкладзены белай сурвэткай. Найчасцей свенцяць яйкі, соль, перац, хлеб, каўбасу, крашанкі і выпечаны або цукровы баранчык.

З юных гадоў запамятала я асабліва Вялікі тыдзень. Тады дзеці і падросткі мелі найбольш працы: трэба было прыбраць панадворкі і вуліцы перад сваёй сядзібай. Добра захавала ў памяці і Вялікі чацвер, калі вярталіся два кіламетры — з царквы ў Шчытах у Крывую — з запаленай свечкай, а пасля абыходзілі свае будынкі, каб блаславіць на ўсё добрае. Таксама запамяталася Вялікая пятніца, калі быў цалкавіты пост і трэба было ісці ў царкву на вынас плашчаніцы. Пасля прыкладання да плашчаніцы вярталіся дадому, дзе трэба было рыхтаваць святочныя стравы.

У суботні поўдзень прыязджаў бацюшка свяціць пасху. У Крывой свяцілі ў некалькіх вызначаных месцах, у тым ліку і на лавачцы перад нашым домам (так ёсць і сёння). Мая бабуля Надзя, а пасля і мама, рыхтавалі вельмі прыгожую свяцонку. У ёй, апрача яек, мяса, была яшчэ мазурка, упрыгожаная надпісам з узбітай пены і цукерак „ХВ" — Хрыстос Васкрос.

Былі велікодныя гульні, напр. у „галубок" ці „жалабок", у якія гуляла я разам з братам і сяброўкамі. Для гэтай гульні найлепш падыходзілі вялікія сені, дзе ў жалабку качалі крашанкі адна за адной. Калі яйка кранула яйка саперніка, выйгрывалася тое яйка; такім чынам можна было выйграць многа „валачэбных".

Сёння свята выглядае падобна, хаця складваецца ўражанне, што дзеці менш радуюцца, чым мы ў іх узросце. А гэта мабыць з той прычыны, што мы пасцілі больш стрымана. І тады свята з багатай ежай было сапраўднай урачыстасцю, — мяркуе спадарыня Лідзія.

Міхал Мінцэвіч

Нястомны бібліёграф

Хаця айцец Рыгор Сасна не раз заяўляў аб намеры закончыць сваю выдавецкую серыю па бібліяграфіі праваслаўя ў Польшчы, аднак даследчыцкая пільнасць не дазваляе яму пакінуць справу на волю лёсу. Дзякуючы нястомнасці даследчыка, які шмат гадоў прысвяціў дакументаванню прысутнасці праваслаўя ў Польшчы і ў свеце, нядаўна выйшла чацвёртая частка *Уступнай бібліяграфіі ўсходняга хрысціянства**, якая змяшчае польскамоўны друк сучаснага перыяду. У кнізе ў алфавітным парадку пададзены амаль тры тысячы анатацый. Агулам ва ўсіх кнігах гэтай бібліяграфічнай серыі зарэгістравана больш за пятнаццаць тысяч кніг, рэцэнзій, артыкулаў, расцярушаных па шматлікіх выданнях — ад спецыялістычных пачынаючы, а на лакальных канчаючы. У апошнім выданні змешчаны анатацыі навейшых публікацый і такім чынам атрымалася вельмі актуальная бібіліяграфія, даведзеная да 2002 года.

Каштоўнасць бібліяграфіі заключаецца таксама ў тым, што аўтар не абмежаваўся да ўсходняга хрысціянства ў сціслым значэнні гэтага слова, але пакінуў у полі сваіх зацікаўленняў шырокі спектр грамадска-палітычных спраў, якія датычаць нацыянальных меншасцей, спавядаючых праваслаўе. Напрыклад, аўтар аднатаваў (анатацыя н-р 14 861) артыкул пра спаленне 11 мая 1945 г. праз польскае падполле вёскі Вілюкі, які быў апублікаваны ў выданні „Новэ Паньство" і палеміку гісторыка на гэту публікацыю. Не абыходзіць маўчаннем удзелу меншасцей у выбарах (13 385), усеагульнага перапісу насельніцтва (13 382), выступлення беларускіх і праваслаўных дзеячаў у абароне сваіх правоў у Міністэрства ўнутраных спраў (14 064). Уважлівы чытач можа знайсці ў кніжцы біяграфічныя цікавінкі. Напрыклад, у анатацыі 13 775 аўтар паведамляе, што вядомы беластокі паэт Ежы Плютовіч (часопіс „Карткі" ў 1997 г. апублікаваў інтэрв'ю із ім) — унук а. Лукі Плютовіча, апошняга настаяцеля Свята-Мікалаеўскага храма ў Бельску-Падляшскім.

Навейшае бібліяграфічнае выданне даволі багатага тэматычнага дыяпазону, з улікам філасофіі, тэалогіі, гісторыі, сацыялогіі і шмат якіх іншых галін ведаў, з'яўляецца неабходным дапаможнікам даследчыкам праваслаўя ў шырокім разуменні гэтага слова.

(вл)

*Ks. Grzegorz Sosna, *Wstępna bibliografia chrześcijaństwa wschodniego. Druki polskojęzyczne okresu współczesnego*, cz. IV, Białystok 2003, ss. 560.

У Старым Ляўкове і Семяноўцы

Будуць толькі I-III класы

У навучальным годзе 2003/2004 у Старым Ляўкове і Семяноўцы (Нараўчанская гміна) пачнуць працаваць аддзяленні Комплексу школ у Нараўцы. Будуць усяго толькі I-III класы. У іх будуць вучыцца наймалодшыя дзеці. Прычыны гэтага — малая колькасць дзяцей у паасобных класах і змяншэнне асветнай субвенцыі ды недахоп грошай у гміннай касе. Справу разважалі на бацькоўскіх сходах з удзелам войта, у Падляшскага куратара асветы ў Беластоку ды на сесіях Гміннай рады ў Нараўцы.

Канчаткова вырашылі абніжыць арганізацыйную ступень вышэйзгаданых школ і пакінуць класы I-Ш. І так малыя дзеці і іх бацькі могуць быць задаволены. Зроблена ўсё магчымае для дабра наймалодшых. Каб ім было блізка хадзіць у школу. Будуць яны бліжэй дому і бацькоў. Вучняў IV, V і VI класаў ды гімназістаў будуць вазіць аўтобусамі ў Нараўку.

Школ у Старым Ляўкове і ў Семяноўцы не замыкаюць! Калі будзе больш дзяцей, для іх адкрыюць у тых жа школьных будынках вышэйшыя класы. Але дэмаграфічныя прадпасылкі на гэта ў бліжэйшыя гады не паказваюць.

Войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч робіць усё, каб вясковыя дзеці мелі добрыя ўмовы для навукі. Школа ў Нараўцы новая ды і адна з найпрыгажэйшых у Падляшскім ваяводстве. Школы ў Старым Ляўкове і ў Семяноўцы адрамантаваныя, з усімі выгадамі. У іх штодзень рыхтуюць смачныя абеды. У іх толькі пазайздросціць умоў да навукі.

Так вось школы ў Старым Ляўкове і ў Семяноўцы далей будуць дзейнічаць і іх лёс шчаслівы.

... А як жа інакш ён абышоўся з закрытымі школамі ў Лешуках, Альхоўцы, Скупаве, Ахрымах і ў Плянце. Усе яны ў Нараўчанскай гміне.

(яц)

Пахаванне Мікалая Нікалаюка

Несправядліва дзеецца на гэтым свеце. Захутка пакідаюць яго добрыя людзі. 26 сакавіка 2003 г. адышоў у вечнасць вядомы педагог, інжынер, дзеяч Беларускага грамадска-культурнага таварыства Мікалай Нікалаюк. 28 сакавіка ў яго пахаванні ўдзельнічала мноства людзей з Гайнаўкі і з іншых мясцовасцей. Прыбыла таксама дэлегацыя ГП БГКТ у асобах Яна Сычэўскага, Валянціны Ласкевіч, Міхася Хмялеўскага і Уладзіміра Юзвюка. Калі мы заехалі ў Гайнаўку на вуліцу Беластоцкую, сустрэлі многа людзей. Падыходзілі яны да труны Мікалая, ставалі на калені, хрысціліся, маліліся за Яго высакародную душу, ускладалі вянкі і кветкі. Пеўчыя прыгожа спявалі хаўтурныя песні, а дочкі Мікалая, Іаанна і Эмілія, стаялі над труною і выціралі слёзы. І 94-гадовая матуля таксама горка плакала. Кахала яна свайго руплівага сына і аддала б сваё жыццё, каб гэта ён адпраўляў яе на могілкі, а не наадварот.

У 12 гадзін у суправаджэнні 4 святароў адбыўся вывад нябожчыка з дому, у якім пражыў ён многа гадоў і да якога спяшаўся пасля працы як добры сын, муж і бацька. За аўтамашынай з труной рушыла паўкіламетровае пахавальнае шэсце, папярэджанае крыжам і жалабнымі харугвамі. Калі шэсце стала набліжацца да сабора, сумным тонам азваўся царкоўны звон.

Ніжняя саборная царква напоўнілася народам разам з прадстаўнікамі мясцовых адміністрацыйных улад і арганізацый, настаўнікамі і вучнямі тэхнікума, якога быў віцэ-дырэктарам. Прыйшлі яны ўшанаваць сціплага, заўсёды добразычлівага і сардэчнага чалавека, які актыўна ўключаўся ў грамадскую працу.

На жалобную ўрачыстасць прыехаў таксама настаяцель Міхайлаўскай царквы з Бельска-Падляшскага а. Ляонцій Тафілюк, які ў мінулым служыў у Гайнаўцы і сам зазнаў Мікалаевай дапамогі царкве. Ён з настаяцелем Свята-Троіцкага сабора Міхаілам Негяревічам у саслужэнні яшчэ трох святароў адслужылі літургію і паніхіду. У пропаведзі настаяцель сабора звярнуў увагу на пасільны ўклад Мікалая ў пабудову дзвюх гайнаўскіх цэркваў. Старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі звярнуўся да нябожчыка такімі вось словамі: „Дарагі, незабыўны наш Мікалай! Прыехалі мы, каб ад імя ГП БГКТ шчыра падзякаваць Табе за ахвярнасць і адданасць беларускасці, за вялікі ўклад працы ў развіццё і ўсе пачынанні нашай нацыянальнай, беларускай арганізацыі". Расказаў ён таксама аб жыццёвым шляху пакойніка як педагога і інжынера.

Затым наступілі найбольш узрушальныя хвіліны паніхіды, калі прагучалі словы „Со святыми упокой" і людзі сталі падыходзіць да труны для развітання.

І я плакаў. А Мікалаеў твар выглядаў так, быццам хацеў сказаць: „Дзякую вам, добрыя людзі, за тое, што вы прыйшлі, бо больш ніколі не ўбачыце мяне".

Пасля паніхіды шэсце накіравалася на могілкі. Гэта апошні праезд пакойнага па вуліцах свайго горада. Па дарозе мінаем новапабудаваны праваслаўны храм, якога звон сумна падзякаваў адыходзячаму ў вечнасць інжынеру за грамадскую працу пры пабудове царквы. Побач царквы могілкі. Звон могільнікавай капліцы сумным рэхам сустракае заўчасна памерлага Мікалая Нікалаюка.

Над адкрытай магілай а. Ляонцій прыпомніў заслугі пакойнага Мікалая перад Богам і людзьмі, падкрэсліў, што дастойны ён, каб Усявышні адкрыў яму дзверы ў царства нябеснае. „Трэба ведаць і аб тым, — сказаў бацюшка, — што ўдзел у пахаванні чалавека гэта святы абавязак людзей".

Мікалай Нікалаюк спачыў побач сваёй жонкі Галены, якая памерла два гады таму. Моцна тады перажыў Мікалай смерць жонкі. Невыносныя душэўныя пакуты можа зразумець да канца толькі той, хто сам пахаваў любімую жонку, незаступнага, вернага друга. Аб гэтым прыйшлося мне з ім пагаварыць у мінулым годзе на беларускім фэсце ў Чыжах. Цяжкія перажыванні напэўна прычыніліся і да яго хваробы і заўчаснай смерці. Няхай добры Бог мае Вас у апецы. Няхай будзе незабыўная памяць аб Вас ува ўсіх, хто Вас паважаў і любіў.

* * *

Мікалай Нікалаюк нарадзіўся 3 сакавіка 1938 г. у вёсцы Курашава Гайнаўскага павета. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Беларускім агульнаадукацыйным ліцэі ў Гайнаўцы і пачаў працаваць настаўнікам у роднай вёсцы. Пасля працаваў на пасадзе дырэктара школы ў Дубічах-Асочных. Адначасова вучыўся ў Настаўніцкай студыі ў Беластоку. У 1964-1977 гг. быў намеснікам школьнага інспектара Павятовага аддзела асветы ў Гайнаўцы. Пасля вучыўся ў Політэхнічным інстытуце ў Беластоку. Атрымаўшы кваліфікацыю інжынера, некалькі гадоў працаваў кіраўніком будаўнічага калектыву БЭП у Бельску-Падляшскім. А ў 1980-1992 гг. быў намеснікам дырэктара Комплексу прафесійных школ у Гайнаўцы.

Мікалай Нікалаюк быў моцна звязаны з дзейнасцю Гайнаўскага аддзела Беларускага грамадска-культурнага таварыства. На працягу многіх гадоў быў членам праўлення аддзела, а ў свой час — намеснікам старшыні аддзела БГКТ, а таксама членам праўлення Грамадскага камітэта пабудовы музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы. На З'ездзе БГКТ у 1984 г. выбраны членам ГП, а з 1988 г. з'яўляўся намеснікам старшыні ГП БГКТ.

Мікалай Нікалаюк актыўна ўключаўся ва ўсе працы БГКТ, а найбольш часу аддаў беларускаму музею ў Гайнаўцы. За прафесійную і грамадскую працу ўзнагароджаны быў шматлікімі медалямі, адзнакамі і ганаровымі граматамі. БГКТ і ўся беларуская грамадскасць пацярпела вялікую страту.

Міхась Хмялеўскі

Беласточчына на старонках „Беларускага летапісу" (1933-1939)

Беларускі культурна-грамадскі і літаратурны часопіс „Беларускі летапіс" выдаваўся ў Вільні з 1933 года да верасня 1939 года. Усяго выйшла з друку 19 нумароў. Часопіс шырока асвятляў культурна-мастацкае і літаратурнае жыццё ў Заходняй Беларусі.

Пісаў у той час „Беларускі летапіс" і пра людзей з Беласточчыны, пра тыя падзеі ў галіне літаратуры і мастацтва, якія непасрэдна былі звязаны з гэтым краем. Няшмат было публікацый, але сёе-тое на старонках часопіса паведамлялася. Гартаючы пажаўцелы ад часу „Беларускі летапіс", цікавыя факты, сапраўды, хочацца запомніць і занатаваць.

У 1937 годзе „БЛ" пісаў пра смерць Мацея Астапчыка. Імя гэтае сёння нідзе не ўспамінаецца. А ў мінулым годзе споўнілася б гэтаму актыўнаму беларускаму дзеячу на Свіслаччыне 90 гадоў. У 1928 годзе Мацей Астапчык быў старшынёю Свіслацкай акруговай управы Таварыства беларускай школы, адным са стваральнікаў прафсаюза работнікаў-гарбароў у Свіслачы, арганізатарам Беларускага кааператыва „Праца" ў той жа Свіслачы. Ён памёр ва ўзросце 35-ці гадоў у Беластоку, дзе яго і пахавалі.

Кожны нумар часопіса „Беларускі летапіс" друкаваў навіны пад рубрыкай „Наша хроніка". У красавіцкім нумары за 1937 год паведамлялася, што, паводле беластоцкай прэсы, была пакарана штрафам 200 зл. Ганна Абуковіч — старшыня ўправы таварыства „Полымя" за тое, што арганізавала таварыства працаўнікоў беларускага тэатра „Полымя" без адпаведнага паведамлення адміністратыўных улад. З-за іх не адбыўся канцэрт у беластоцкім тэатры „Palace". Адначасова „БЛ" пісаў, што „акружны суд у Беластоку падаў да публічнага ведама ў органе польскай коопэрацыі „Spólnota pracy" № 7 з дня 1.IV.1937 году аб зарэгістраваньні 5 лютага г.г. беларускага коопэратыву пад назовам „Аб'еднаньне Працаўнікоў Беларускага Тэатру „Полымя", Коопэратыў Працы з адказнасьцю паямі". Статут кааператыва мае на мэце даваць заробак сваім сябрам у кааператыўным аб'яднанні тэатральных працаўнікоў, пашырэнне тэатральнай культуры ў беларускіх асяроддзях і фаховае дасканаленне сваіх сяброў; вядзенне ўсялякіх тэатральных прадпрыемстваў; арандаванне, набыванне і будова нерухомасці, вядзенне кааператыўна-ўзгадаваўчай дзейнасці і прапаганды сцэны і беларускага тэатра. Новая беларуская кааператыўная арганізацыя распачала працу над „арганізаваннем струннае аркестры, хору і драматычнае трупы".

Часопіс „БЛ" у той час шмат пісаў пра Міхася Забэйду-Суміцкага. Пра яго канцэрты ў Вільні цікава распавядаў Франук Грышкевіч, а пра канцэрты ў Беластоку — Сяргей Крывец. Дарэчы, беларускі паэт Сяргей Крывец (1909-1945) у тую пару жыў у Беластоку. Ён вучыўся ў Беластоцкім педінстытуце, а ў 1944 годзе быў прызваны ў армію і загінуў пры штурме Гдыні. Вось як успрымалі беларусы Беластока канцэрт Міхася Забэйды-Суміцкага: „Трэба было бачыць на канцэрце, як публіка рэагуе на кожны паварот, на кожны пераход чароўнага голасу нашага мастака, які з першых тонаў апаноўвае душою публікі і з асаблівай лёгкасцю вядзе яе праз лабірынты далікатных перажыванняў. Іменна, трэба бачыць і адчуць, як саля замірае з журбой «Маладога дубочка», як дрыжыць, згарае агнём юнацтва з песняй «Ці грэх цябе любіць?» У людзей старых, адарваных ад народнага грунту, у каторых усякая сувязь з нашым жыццём здаецца занікла, мы бачылі слёзы. Гэта былі слёзы шчасця і радасці. Так было на канцэрце ў Беластоку 6 чэрвеня..."

Вось так апісваў Сяргей Крывец у сваім допісе канцэрт Міхася Забэйды-Суміцкага. Дарэчы, канцэрт гэты ладзіў Беларускі тэатральны кааператыў „Полымя". Акампаніраваў у Беластоку спеваку прафесар Урштэйн з Варшавы. Аб гэтым таксама часопіс „БЛ" паведамляў (№ 6-7, 1937 г.). „Беларускі летапіс" змясціў і інфармацыю, дзе пісалася наступнае: „Беластоцкі суд звольніў ад штрафу, якім пакарана была Гарадзкім Старастам у Беластоку Старшыня Беларускага тэатральнага коопэратыву гр. Абукувіч..." (У прозвішчы зроблена памылка. Відаць, трэба пісаць Абуковіч — С. Ч.).

Пра „Полымя" сёння можна напісаць асобны артыкул. Бо ў канцы 30-х гадоў мінулага стагоддзя гэты тэатральны кааператыў быў на Беласточчыне даволі вядомы сваёй беларускай нацыянальнай дзейнасцю і актыўнасцю: ставіў спектаклі, меў струнны аркестр і хор. Іншая справа, што мясцовыя ўлады забаранялі дзейнасць „Полымя": „Беластоцкі Тэатральны Беларускі Коопэратыў «Полымя» меўся ставіць два спэктаклі 16 і 17 кастрычніка ў м-ку Гарадок каля Беластока. Прыгатаваны былі п'есы: «Пакой у наймы», «На вёсцы», арганізавана струнная аркестра і хор. Падалі просьбу аб дазвол на спэктаклі, але Беластоцкі Павятовы Стараста прыслаў адмову, матывуючы тым, што ў гэтым часе і ў тым жа мейсцы «прамышляюць» ужо іншыя арганізацыі" („БЛ", № 10-11, 1937 г.).

На старонках „Беларускага летапісу" часта друкавала свае вершы Ганна Новік. З артыкуламі на розныя тэмы выступаў Франук Грышкевіч. Найперш, здзіўляе сваёй шчырасцю допіс „Сьмерць Т. Масарыка". У ім аўтар расказвае пра жыццё і дзейнасць гэтага палітыка, а ягоную смерць называе „сумам сусьветнае дэмакрацыі". І нават сёння з Франуком Грышкевічам нельга не пагадзіцца. Тамаш Масарык заўсёды прыхільна ставіўся да беларусаў і да ўсіх славянскіх народаў.

Сяргей Чыгрын

Фільмавы вечар

Веснавыя вечары — найлепшы час для шпацыраў, прыемным завяршэннем якіх можа стаць наведанне кінатэатраў, якія апошнім часам прапануюць штораз навейшыя і лепшыя фільмы. На гэты тыдзень прапаную тры кінакарціны.

„Прааналізуй гэта!" (*Analyze That*) — камедыя аўтарства Гаральда Рэміса з Робертам Дэ Ніра, Білі Крысталам і Лісай Кудроў у галоўных ролях.

Пол Віці, адзін з самых буйных гангстэраў, сядзіць у турме, дзе яго жыццю пагражае небяспека з боку канкурэнтнага гангу. Каб вырвацца з турмы, мафіёзі пачынае прыкідвацца псіхічна хворым, а робіць гэта так умела, што пераконвае нават шэфа ФБР, які яго выпускае на свабоду. Ставіць пры гэтым толькі адну ўмову — адказнасць за дзейнасць і лёс мафіёзі возьме на сябе ягоны доктар Бэн Собел. Той, несвядомы хітрасці — згаджаецца! Праблемы пачынаюцца, калі Віці паяўляецца ў хаце доктара. Аказваецца, хвароба была адным вялікім ашуканствам, а жыццё пад адным дахам з мафіёзі становіцца кашмарам! Сітуацыя змяняецца (але ці на лепшае?), калі Віці атрымоўвае прапанову працы ў якасці эксперта па мафіі пры прадукцыі фільма. Хітры Віці скарыстоўвае сітуацыю і... А што было далей, пабачце самі!

„Як Майк" (*Like Mike*) Джона Шульца гэта прапанова для моладзі ва ўзросце да 15-ці гадоў, але не толькі!

Гісторыя амаль казачная: нешчаслівы, малады сірата Кэлвін знаходзіць старыя красоўкі, але не такія звычайныя, бо ў іх хадзіў і гуляў у баскетбол сам Майкл Джордан. Магія ботаў даводзіць да таго, што Кэлвін гуляе ў баскетбол як яго кумір і хутка прыцягвае да сябе ўвагу медыяў і трапляе ў НБА, дзе іграе з самымі слаўнымі баскетбалістамі. Але не ўсё выглядае так цудоўна. Паяўляецца зайздросны сябра, які хоча ўкрасці красоўкі і менеджэр, які хоча фінансава выкарыстаць хлапчука. Да гэтага некалькі сужонстваў, адно горшае ад другога, якія за любую цану хочуць усынавіць Кэлвіна. Але, як то бывае ў казках, усё закончыцца добра, але як добра — даведайцеся самі!

На канец прапаную найноўшы фільм Мацея Слесіцкага — „Шоу" (*Show*). Гэта чарговая камедыя з найлепшымі зоркамі польскага кіно! Цэзары Пазура, Ежы Штур, Дарота Сэгда — гэта некаторыя з акцёраў, якіх пабачыце на вялікім экране.

Галоўны герой Чарэк (цёзка Пазуры) — гэта дробны ашуканец, які закахаўся ў неадпаведную дзяўчыну — Бэатку, дачку мафіёзі. Каб было цікавей, аказваецца, што дзяўчына цяжарная, а сям'я Бэаткі пастанаўляе знішчыць „маладога бычочка" (так называюць Чарка). Уцякаючы ад мафіі, Чарэк трапляе на адбор у тэлешоу, у якім апрача спакою ад сям'і Бэаткі, мае магчымасць выйграць два мільёны злотых. Чаму выбірае тэлевізію? Адказ просты, бо на вачах мільёнаў гледачоў нават мафія яго не зачэпіць. Але шчасце не працягваецца доўга... Хтосьці пачынае забіваць па чарзе ўдзельнікаў тэлешоу, а ў злачынствах абвінавачваюць Чарка! Як з гэтым справіцца герой фільма, як закончыцца яго гісторыя пабачце самі, бо і варта!

Паўліна Шафран

Птушкі, зіма і людзі

Птушак, якія паспелі ўжо прыляцець з зімоўкі ў цёплых краях, сустрэла зіма. Снег і мароз асабліва дакучаюць буслам. Арнітолагі з Паўночнападляшскага таварыства аховы птушак у Беластоку інфармуюць усіх, хто хоча памагчы перамерзлым і галодным птахам. Найгорш буслам, якія пад снегам і лёдам не могуць знайсці спажывы. Буслы, каб пратрымацца, захаваць сілу, стаяць нерухома на гнёздах. Калі стаіць пара разам, магчыма, што самка паспела ўжо знесці яйка. Некаторыя буслы паяўляюцца ля дарог. У такім выпадку трэба акрэсліць яго стан — мабыць, ужо не дасць рады ляцець. Калі ёсць магчымасць, трэба памясціць такую птушку ў цёплым памяшканні, але не з курамі (каб не перанесліся паразіты), накарміць несалоным сырым мясам ці рыбай.

Іншыя птушкі неяк спраўляюцца з голадам. У цэнтры Беластока каля сметнікаў увесь дзень кружаць чайкі, просяць есці.

— Гэтыя чайкі прылятаюць з вадасховішча Дайліды, — тлумачыць Дарыюш Ахрымюк з ПТАП. — Зімавалі яны ў цяплейшых рэгіёнах Еўропы — у Нямеччыне, у Францыі, часам на захадзе Польшчы; калі зіма трапіцца цяплейшая і іх вадаём не замярзае, на зімоўку яны не выбіраюцца, неяк вытрымліваюць. Чым іх падкормліваць? Бульбай, хлебам, толькі не намочаным.

Спадарыня Вікторыя Мітрусяк, старажылка з вуліцы Вясёлай у Беластоку, пенсіянерка, якой ад аплат на жыццё і лякарствы застаецца 100 злотых у месяц, штодзень купляе для перамерзлых птушак шэсць буханкаў чэрстваватага хлеба, кулёк булачак. Якраз на пажылых людзей найбольш могуць разлічваць птушкі, якія вярнуліся на радзіму ў неспрыяльны час.

— І мы былі пералётнымі птахамі, хто ў Сібіры, хто ў стэпах... Ведаем, што такое голад, холад і спачуванне, — кажа бабуля Вікторыя, раздрабляючы хлеб для чаек ля сметніка ў цэнтры Беластока, на скрыжаванні трох вуліц.

Міра Лукша

Рыхтуецца выстаўка старых машын

Агратурыстычная гаспадарка „Купала" Ірэны і Зіновія Галёнкаў у Арэшквае звяртаецца да людзей добрай волі з заклікам перадаваць бясплатна непатрэбныя ўжо конныя сельскагаспадарчыя машыны і прылады для аднаўлення і змяшчэння іх на адмысловай выстаўцы. Планаваная сталая экспазіцыя, якая размесціцца ў Арэшкаве, будзе служыць перш за ўсё дзецям і моладзі для азнаямлення з працай сялян у недалёкім мінулым.

Арганізатары выстаўкі забяруць ахвяраваныя машыны сваім транспартам, а пры кожным экспанаце змесцяць табліччу з інфармацыяй пра ахвярадаўцу. Кантактны тэлефон: 604 99 54 21. (вл)

8 Сакавіка ў Гайнаўскай гімназіі

Вельмі, вельмі даўно, якіхсьці пятнаццаць гадоў таму 8 Сакавіка было паўсюдным святам усіх жанчын, а таксама мужчын, якія выпівалі за іхняе здароўе. На некалькі гадоў прыглумілі яго Валянцінкі, аднак традыцыйнае свята зноў вяртаецца. У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы з нагоды Міжнароднага дня жанчын адбыліся два мерапрыемствы — адно ў гімназіі, а другое ў ліцэі. Гімназічную ўрачыстасць падрыхтавалі сябры з II „а" класа.

Перад трэцім урокам гімназісты сабраліся ў актавай зале на спектакль. На пачатку дзяўчаты танцавалі, затым Кацпэр Ваінскі павіншаваў усіх жанчын, а вучні падорылі настаўніцам кветкі. Пасля Адам Галёнка, Марыюш Панькоўскі, Кацпэр Ваінскі і Марыюш Баран пераўвасобіліся ў акцёраў і паказалі гумарыстычную сцэнку з выкарыстаннем музычных матываў. Цікава выступалі таксама дзяўчаткі, якія на насычанай гумарам сакавітай беларускай мове прадставілі вясковыя гісторыі.

На заканчэнне мастацкай часткі класныя сяброўкі танцавалі пад гукі песні „Гэта ўжо канец". А на сапраўдны канец зайграў наш рок-гурт. Выступленне яго было так дынамічнае, што часткі інструментаў трэба было збіраць па цэлай зале (але гэта ўжо быў жарт). А наша сяброўка Амэля ўзнялася на вышыню і засталася стаяць на адной назе.

Тэкст і фота Андрэя Грыгарука

Вер – не вер

Даражэнькі Астроне! Мой сон (ён прысніўся мне на днях) мяне вельмі напужаў. А справа ў тым, што мая дачка ўжо сем гадоў жыве за граніцай, аж у Амерыцы. Яна ўжо дарослая, ёй амаль пяцьдзесят гадоў. А мне прыснілася, што яна яшчэ зусім маленькая, мо годзікаў пяць ці шэсць. У прыгожай сукеначцы, бландзінка, але цалкам п'яная. Я запыталася ў яе, чаму яна напілася. То ж ты, кажу, маленькая, як гэта здарылася? А яна ўсміхнулася, апусціла вочкі і кажа: „Не ведаю". Ага, у руцэ яна трымала вялікую жывую рыбіну. Я спыталася ў яе, адкуль яна ўзяла гэту рыбіну, а яна мне сказала, што ўзяла з ракі.

Нейкае балота, яно перашкаджала мне ўцячы дахаты. А дачушка кажа, што тут было возера. Не ідзі, мама, кажа малая, бо ў гэтым месцы праваліліся ўсе будынкі горада. Ідзі па іншай дарозе, то дойдзеш дахаты. І я ў страху прачнулася.

Дарагі Астроне! Я вельмі баюся, каб хаця штосьці не здарылася з маёй дачкой. Усё ж такі вайна на свеце...

Ніна

Ніна! Нельга выключыць факту, што табе такое сніцца ў сувязі з пачаўшайся вайной. Твая дачка жыве ў Амерыцы, усе баяцца тэрарыстаў, а ты не маеш спакою ні ўдзень, ні ўначы.

Але наогул мне здаецца, што ў тваёй сям'і нехта робіць табе кепскую работу. Усё было нібы добра, пра гэта сведчыць твая маленькая, белакурая дзяўчынка, ды толькі чаму яна так напілася? У сваю чаргу, тая вялікая жывая рыбіна сведчыць пра тваю цяжкую, але вельмі сэнсоўную працу. І хтосьці табе ў гэтым перашкодзіць з-за сваёй дурноты.

Тое балота, якое перашкаджала табе дайсці дахаты, можа абазначаць правал тваіх планаў, так як праваліліся там усе будынкі горада. А мо нехта абліе цябе памыямі. Мо дачка, якая зрабіла нейкую памылку ў адносінах да цябе, падасць табе руку, бо і паказала ж табе дарогу дахаты, па якой можна было смела прайсці.

Астрон

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Акрамя ўсіх астатніх каштоўнасцяў унясем яшчэ ў Еўрасаюз унікальную архітэктуру і жменьку людзей у якасці жывога дадатку да яе...

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Сустракаюцца дзве сяброўкі:

— Ты чула пра маё гора?

— Яшчэ не.

— Тры дні ўжо будзе, як мой муж выйшаў з сабачкам на шпацыр і след па іх прапаў...

— Якая жудасць! А такі ж прыгожы і мудры быў твой сабачка...

* * *

— Ты замужняя?

— Не.

— Дзеўка?

— Не.

— Удава?

— Барані Бог!

— Дык які твой грамадзянскі стан?

— Я цяпер нарачоная!

* * *

— Як табе атрымаўся твой першы самастойны абед?

— Няблага. Лекар гаворыць, што муж хутка выйдзе з бальніцы.

* * *

— Мой муж выдатны знаўца кулінарнай справы!

— Цяпер я разумею, чаму ён сталуецца на горадзе.

* * *

— Гавораць, твой муж атрымаў павышэнне дзякуючы табе...

— Сапраўды?

— Бо вечарамі больш сядзіць на рабоце, чым дома.

* * *

Гутараць два сябры:

— Уяві сабе, едучы апошнім разам на паляванне, забыў я забраць з сабою ружжо.

— Няўдача! А калі ты гэта заўважыў?

— Калі ўручаў жонцы зайчыка.

* * *

— Як справы ў тваёй фірме?

— Не пытай! У мінулым годзе меў такі марны прыбытак, што падаткавую дэкларацыю напісаў згодна з праўдай.

* * *

— У мяне столькі даўгоў, што ад гора не магу ноччу спаць.

— Дык як жа ты, чалавеча, жывеш?

— Сплю ўдзень.

* * *

Шэйх завітвае ў фешэнебельную мастацкую галерэю і купляе дзве карціны Ван Гога і шэсць Пікасо.

— Якія цудоўныя падарункі, — заўважае маршанд, — хіба пад ёлачку?..

— Падарункі? Гэтыя карціны вышлю ў якасці святочных адкрытак!

* * *

Мужык страхуе хату ад пажару:

— Скажыце, — пытае страхоўшчыка, — колькі б я атрымаў, калі б хата згарэла заўтра?

— Мабыць, гадоў шэсць.

* * *

Земляроб наракае:

— Секвестратар горшы ад чорта, бо рэквізаваў маю карову, а чорт яе не забраў, хаця я неаднойчы гаварыў: „Каб цябе чорт узяў!"

* * *

— Курэнне папяросаў дастаўляе табе асалоду?

— Адчапіся! Зусім не, але калі закуру, тады цешча хуценька выходзіць з хаты.

* * *

Зяць пытае цесця:

— Цесцю, чаму вы ажаніліся з цешчай?

— Дык і ты ўжо здзіўляешся!?

Адгаданка



1. 2, 2. вынік паэтычнага натхнення: можа быць з рытмам і рыфмай, а можа быць і зусім белы, 3. гнуткі лазовы ці бярозавы дубец або літаратурнае прозвішча Цімаха Васільевіча Крысько (ягонае літаратурнае імя — Васіль). (Ш)

Рашэнне адгаданкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 9 нумара

Вялікі горад Беласток

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Без Агаты

І так я адправіў сваю жонку ў Амерыку. На два месяцы. Каб бачыла, што не баюся застацца адзін у доме і краіне, і каб я давяраў маёй палове на чужыне, дык бадзёры быў, хоць не занадта вясёлы. Каб не падумала, што цешуся з раптоўнай волі. І каб не здалося ёй, што ад голаду і суму памру, вось, адзін.

— Ты глядзі, не пільнуйся Колі Здунюка. Хутчэй Збышкі Насквяркі, і каб ягоная Тамара мела на вас вока. Я там з Тамаркай усё абгаварыла...

— І што, даносы слаць будзе... Інтэрнэтам!?

І праўда, старыя Насквяркі падключыліся ў сусветную сетку, і адным пстрычкам той свет у іх ёсць у хаце. Не пабаяліся тэхнікі, як і Міхась Хмялеўскі, які шпарыць цяпер свае тэксты на камп'ютэрнай клавіятуры. Ці я праз той Інтэрнэт не буду занадта спутаны?

— Тэлефоны задарагія, калі што... А, можа, і ты купіў бы камп'ютэр... — Агата, прысеўшы на чамаданах, акінула гаспадыніным вокам усю кватэру і мяне, беднага.

— Ай, столькі грошай пайшло на твае білеты... І на шматкі...

— А купі, купі сабе камп'ютэр, гэта лепш, чым іншыя прыемнасці, у хаце цябе затрымае...

Ну і што? Трымаўся, трымаўся... Гуляў на волі, як ашалелы. Вясна ж! Праз пару дзён, усё ж, пайшоў па крамах з камп'ютэрнай тэхнікай. Дарагія цацкі! Але намовілі мяне купіць „складак". І з Міхасём ды Збышкам прывезлі мы ў ацішэлую хату новую цацку.

Няцяжкая справа, навучыцца. І стары, і малы зразумее, хоць малому, вядома, лягчэй. Пазваніў я пляменнікам, вучням пачатковай школы. Віталік і Ганулька раз-два ўбілі ў маю галаву, што і як. І трапіў я ў няволю.

Толькі вочы адплюшчваў зранку, хутка выбягаў з Гарэшкай на вуліцу. Тая толькі разбяжыцца — валаку нашу сучку назад у хату. Кіну ёй есці, сам сухі хлеб у рот — і за камп'ютэр. Пакуль бегаў яшчэ па старонках Інтэрнэту, нічога — столькі ведаў, столькі вестак! А ўключыўся ў размовы-гавэнды з чужымі пакуль мне людзьмі — пачалося!

Пазнаёміўся з нейкай Агаткай. Пісала мне, што харошая ды разумная, ды нясмелая вельмі. Ну, не паверыш? І дасціпная такая — пляце тую нітку размовы, падчапляе цябе за жывое. Бачу, з такой сядзеў бы і слухаў бы, што бае. Адчуваеш — братняя душа. Ну, другі Вандал Арлянскі, толькі ў жаночым целе...

Да таго — з Беластока. Ну, як не спаткацца? Пазнаёміцца бліжэй з братняю душой? Файнейшай, мабыць, і за Колю, і за Збышка, старых паскуднікаў. Гэты Збышка, што п'е ўсё жэньшэнь ды вітамін Q-10, набраўшы моцы і дурных думак, усё ж, намовіў мяне. Гэта ж ніякая не здрада — спаткацца, пагутарыць. Хай бы і разам з хлопцамі. Каб бяспечней. І, калі б што, нябрыдка было. І каб Агаце сказалі, што нічога страшнага не адбылося.

Дамовіліся мы ў ненайтаннейшай кавярні „Кастэль", у агародчыку. Характэрная памета — у яе руках „Кур'ер падляшскі". Ой, каб не была замаладая.... І каб не застарая... Не, ніякіх такіх думак не было ў маёй галаве, не думайце...

Хлопцы схаваліся за сценкай-сеткай, заказалі па піўцу. Я ўкрочыў на залу. Ды ніякай Агаты там не было. З пакамечанай газеткай у далонях сядзеў толькі Макхолад, смактаў узмоцнены сок.

— Ты не бачыў Агаты?

— Ага! — засмяяўся наш малады сябра.

Вандал Арлянскі

Юбілейны падарунак

Надышоў дзень нараджэння мядзведзя Сандара Жоржавіча. Аб неспадзяванцы, якую з гэтай нагоды можа зрабіць уселясное краўніцтва, думала яно ўжо тыдзень.

— Што б яму тут такое зрабіць? — раздумвала ў час тайнай сустрэчы кіраўніцтва лань Гаўрусіха.

— У нашага ж мішкі ўсё ж ёсць, ну, і лес ён мае, і нас ён мае, — узняла бровы вавёрка Кацюша.

— А калі нават чагосьці ў яго няма, то, калі захоча, мець будзе, — дакінуў дзік Свіналыч.

У вечар да юбілею найбліжэйшы супрацоўнік Сандара Жоржавіча дзяцел Стукач убіў дзюбу ў малады дуб. І адубеў у одуме. Раптам заклекатаў:

— Эўрыка! У мядзведзя нашага любімага няма помніка! У іншых лясах такія вялікія як ён маюць, ну, або мелі. Так. Паставім яму помнік. На паляне ж стаіць цокаль ад зрэзанага старога дуба.

— Як геніяльна, — бліснулі ланіны вачыскі.

— Будзе наш Сандар стаяць на цокалі, пярэднімі лапамі будзе паказваць светлы шлях. Пад сонцам і пад месяцам яго скульптурная велічнасць будзе нагадваць яго задумы, — аддаўся мроям дзік Свіналыч, плёхаючыся ў гразі.

Кіраўніцтва зараз жа ўзялося за працу. Праект падрыхтавала вядомая рознымі талентамі лань. Дзік прыкаціў аграмаднае бервяно. Вавёрка і дзяцел узяліся за яго апрацоўку. Помнік стаяў ужо на досвітку дня юбілею. Сябры кіраўніцтва, стомленыя ды шчаслівыя, чакалі юбіляра.

Урэшце мядзведзь паказаўся. Увайшоў на паляну і... збаранеў. Кіраўніцтва ўжо расчыніла дзюбы і пысы, каб адспяваць оду. Раптам Жоржавіч зароў.

— А гэта што такое?!

— Гэта помнік-увекавечнік, — затрэслася вавёрка.

— Та-а-ак? — зларадна глянуў на яе мядзведзь.

Стома ад непраспанай ночы адбегла ад сяброў кіраўніцтва. Стоячы дасюль радком перад мядзведжай велічнасцю, адвярнуліся ў бок свайго твора. На цокалі бачыўся ні то мядзведзь, ні немядзведзь: васьмілапы, чатырохслепаковы, шасцівухі. Млеючай праектантцы лані раз'ехаліся капыткі.

— Гэта канец і капец, — прадбачыў у думках дзяцел.

Тым часам мядзведзь ужо больш нічога не сказаў. Раз'яраны, падаўся ў сваю бярлогу. Кіраўніцтва засталося на паляне, атрупянелае ад страху. Сандар кульнуў, увесь у нервовых дрыжыках, бочку мёду, лёг і адразу заснуў. Такая была ягоная заўсёдная рэакцыя на стрэс. Гэтым разам кідаўся ў сне, цяжка соп і хрыпеў. Трызніў, што ягоны няўдалы помнік змяя Ссапія і вуж Ззянон аплятаюць вяроўкай, здзіраюць з п'едэстала і валакуць яго, дзеля ўцехі лясное браціі, па карчах і ўзлесках. Урэшце, топяць у багне, дзе прападае на векі вечныя. І толькі ягоная велічнасць, пазбаўленая цялеснай апоры, усплывае наверх.

МакХолад

ISSN 0546-1960